Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная Партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і Мінскага Абкома КП(б)Б

№ 5 (6887) | 7 студзеня 1941 г., аўторак | ЦАНА 10 КАП.

Всесоюзная Б. Библиотека

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Насустрач XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі.

Закрыўся агульны сход Акадэміі навук БССР.

Нарада перадавікоў сельскай гаспадаркі.

Раённыя канферэнцыі настаўнікаў Мінска.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ:

Е. Левікаў — За аператыўную і дзейсную партыйную інфармацыю.

С. Куцаеў — Райком арганізоўвае работу мясцовай прамысловасці.

НА ТЭМЫ ДНЯ. Аб дошках пачота. Правільна эксплуатаваць і эксплаатаваць жыллёвую гаспадарку.

АРТЫКУЛЫ:

Е. Уралава — Да студзеньскіх настаўніцкіх парад.

Е. Зрэнгрос — Газеце «Акцябр» — 15 год.

А. Суворaў — Агульны сход — гаспадар калгаса.

Р. Сыркін — Груба парушаюць тэхналагічную дысцыпліну.

М. Піскуноў — Шчодрыя дзядзі з Белгалоўмаслапрома.

КРЫТЫКА І БІБЛІЯГРАФІЯ. **С. Раскін** — Аб журнале «Совецкая школа».

ЗА РУБЯЖОМ:

Англа-германская вайна. Германскія паведамленні. Англійскія паведамленні.

Паведамленне германскага інфармацыйнага бюро аб франка-германскіх адносінах.

Ваенныя дзеянні ў Албаніі.

Здача італьянскіх войск у Бардыі.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі.

Кіраўніцтва прамысловасцю—у цэнтр увагі партыйных арганізацый!

Снежаньскі пленум ЦК КП(б)Б прыкаваў увагу партыйных арганізацый да пытанняў кіраўніцтва прамысловасцю.

Абмеркаванне вынікаў пленума ЦК КП(б)Б на сходах партыйных актываў, у пярвічных партыйных арганізацыях паказала, што недахопы ў справе кіраўніцтва прамысловасцю, дапушчаныя Мінскім гаркомам КП(б)Б, характэрны для значнай часткі гаркомаў і райкомаў партыі.

Мерапрыемствы па ўмацаванню працоўнай дысцыпліны і павышэнню якасці выпускаемай прадукцыі, праведзеныя партыяй і ўрадам, забяспечылі далейшы ўздым работы прамысловасці. Там, дзе партыйныя арганізацыі па-большэвіцку змагаюцца за рэалізацыю Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР, дасягнуты запраўды адчувальныя поспехі. 22 прадпрыемствы Мінска датэрмінова выканалі праграму 1940 года. Гэтыя і многія іншыя фабрыкі і заводы паспяхова разгарнулі работу і з самага пачатку новага гаспадарчага года.

Аднак, створаныя мерапрыемствамі партыі і ўрада велізарныя магчымасці для далейшага росту прадукцыйнасці працы, павелічэння выпуску прадукцыі не былі поўнасцю скарыстаны. У гэтым і выявілася слабасць, недастатковасць работы Мінскага гаркома, як і многіх іншых гаркомаў і райкомаў партыі, у галіне кіраўніцтва прамысловасцю.

У выніку рад прадпрыемстваў не выканалі сваіх планаў. А на такіх прадпрыемствах, як завод імені Варашылава, друкарня імені Сталіна, вельмі дрэнна абстаіць справа з выкананнем якасных паказальнікаў; сабекошт прадукцыі ў 1940 годзе не толькі не зніжан, а значна перавышан супроць плана.

Калі-б Мінскі гарком партыі і горрайкомы глыбока і аператыўна кіравалі прамысловасцю, не спазняліся са сваімі мерапрыемствамі, не фіксіравалі-б толькі факты, а своечасова падымалі партыйныя арганізацыі на барацьбу з гэтымі недахопамі, яны былі-б своечасова ліквідаваны.

Так абстаіць справа не толькі ў Мінску. Узяць да прыкладу Нова-беліцкі райком партыі горада Гомеля. Рад прадпрыемстваў гэтага раёна — Дрэваапрацоўчы камбінат, фабрыка «Везувій», завод «Ізапліт»—не выконваюць вытворчых планаў. Райком партыі не прыняў дзейсных мер да навядзення большэвіцкага парадку на гэтых прадпрыемствах. Між тым, там дрэнна арганізавана праца, многа тэхнічных непаладкаў, яшчэ поўнасцю не зжыты прагулы і спазненні на работу. Пярвічныя партыйныя арганізацыі гэтых прадпрыемстваў не клапаціліся аб разгортванні стахаНаўскага руху, сацыялістычнага спаборніцтва. Райком-жа партыі мірыўся з такімі фактамі.

Пленум ЦК КП(б)Б падкрэсліў, што Мінскі гарком КП(б)Б, горрайкомы, пярвічныя партыйныя арганізацыі пясуць непасрэдную адказнасць поруч з дырэктарамі прадпрыемстваў за работу фабрык і заводаў. Гэтае ўказанне датычыць усіх гаркомаў, райкомаў, вытворчых пярвічных партарганізацый Беларусі. Пленум абавязаў іх умацніць партыйнае кіраўніцтва прамысловасцю і транспартам, знішчыць непаладкі ў рабоце прамысловасці, дапамагчы дырэктарам прадпрыемстваў устанавіць найстражэйшую тэхналагічную і працоўную дысцыпліну, узорны парадак на фабрыках і заводах.

У новым гаспадарчым годзе прамысловасць нашай рэспублікі будзе развівацца яшчэ больш шпаркімі тэмпамі, чым у мінулыя годы. Перад усімі галінамі прамысловасці адкрыты багацейшыя перспектывы.

Партыя і ўрад аддаюць развіццю прамысловасці Беларусі велізарную ўвагу, адпушчаны вялікія сродкі на будаўніцтва новых магутных электрастанцый, рада буйных прадпрыемстваў. Не трэба даказваць, што гэта накладае на партыйныя арганізацыі вялікую адказнасць. Кіраўніцтва прамысловасцю павінна быць пастаўлена ў цэнтры ўвагі партыйных арганізацый.

Мінулы год прынёс многа выдатных поспехаў у вырашэнні пастаўленай таварышам Сталіным гістарычнай задачы — дагнаць і перагнаць галоўныя капіталістычныя краіны таксама і ў эканамічных адносінах. У новым гаспадарчым годзе, які з'яўляецца перадапошнім годам трэцяй сталінскай пяцігодкі, мы павінны дабіцца яшчэ больш высокіх дасягненняў у рабоце прамысловасці і транспарта. Для гэтага ёсць усе ўмовы.

Пастанова ЦК ВКП(б) аб скліканні XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі выклікала вялікі палітычны і вытворчы ўздым у краіне. Калектывы рабочых і служачых бяруць на сябе новыя абавязацельствы. Партыйныя арганізацыі абавязаны так наладзіць кіраўніцтва прамысловасцю, каб узятыя абавязацельствы былі поўнасцю выкананы.

Наша партыя паставіла зараз як адну з галоўных задач — узняцце культуры вытворчасці, забеспячэнне найстражэйшай тэхналагічнай дысцыпліны.

Строгая тэхналагічная дысцыпліна побач з узорнай дысцыплінай працы памножаныя на высокі энтузіязм рабочых, тэхнікаў, інжынераў — вось тая крыніца, якая забяспечыць нам больш эфектыўнае скарыстанне багатай тэхнікі, узніме прадукцыйнасць працы і якасць прадукцыі.

Удасканаліць і стабілізаваць тэхналагічныя працэсы, арганізавана скарыстоўваючы ўсё тое новае, што ўносяць у працу перадавыя стахаНаўцы, інжынеры, майстры,—такая задача.

Партыйным арганізацыям трэба паклапаціцца аб тым, каб дырэктары прадпрыемстваў, галоўныя інжынеры, начальнікі цэхаў, майстры поўнасцю скарысталі свае правы адзіначальнікаў, каб яны сталі поўнаўладнымі гаспадарамі на вытворчасці — без гэтага нельга ўстанавіць большэвіцкага парадку на прадпрыемстве.

Разам з тым вытворчыя партыйныя арганізацыі павінны яшчэ паўней і шырэй ажыццяўляць сваё права кантроля дзейнасці адміністрацыі. Партарганізацыя не мае права праходзіць міма фактаў безгаспадарчасці, парушэнняў працоўнай і тэхналагічнай дысцыпліны, растрэньвання сыравіны, паліва, электраэнергіі. Мабілізуючы комуністаў прадпрыемства на ажыццяўленне іх авангарднай ролі, партарганізацыі павінны прад'яўляць больш высокія патрабаванні да ўсіх кіраўнікоў. Па ўсякаму вытворчаму пытанню партарганізацыі трэба мець сваю думку, абгрунтаваную, аснаваную на глыбокім веданні вытворчасці, эканомікі. **Высокая арганізаванасць і высокая патрабавальнасць — галоўныя ўмовы паляпшэння партыйнага кіраўніцтва прамысловасцю.**

У справе ўмацавання тэхналагічнай дысцыпліны і папулярызацыі вопыту стахаНаўцаў вялікую ролю павінны адыграць партыйна-тэхнічныя канферэнцыі. Такія канферэнцыі адбыліся ўжо па многіх прадпрыемствах рэспублікі. Большасць іх прайшла на высокім узроўні і дала добрыя вынікі. Комуністы бліжэй падышлі да актуальных праблем тэхнікі і эканомікі прадпрыемстваў. Гаркомам і райкомам КП(б)Б неабходна абагуліць лепшы вопыт гэтых канферэнцый, перадаць яго астатнім партарганізацыям.

Неабходна таксама яшчэ больш узняць ролю і значэнне агульных партыйных сходаў у вытворчых партарганізацыях. Глыбокае і дзейснае абмеркаванне важнейшых вытворчых пытанняў павінны заняць на іх яшчэ большае месца чым да гэтага часу.

Зараз асабліва важна, каб партбюро прадпрыемстваў удзялялі значна больш увагі кіраўніцтву сацыялістычным спаборніцтвам і стахаНаўскім рухам. Пленум ЦК КП(б)Б патрэбаваў забяспечыць усім стахаНаўцам найлепшыя вытворчыя ўмовы для высокапрадукцыйнай работы, дабіцца павышэння кваліфікацыі вытворчых кадраў і безумоўнага выканання норм выпрацоўкі ўсімі рабочымі.

Няма такой задачы, якая-б была не пад сілу большэвікам. Сур'ёзна ўзяўшыся за паляпшэнне партыйнага кіраўніцтва прамысловасцю і транспартам, забяспечым новы ўздым у рабоце фабрык, заводаў, чыгунак, яшчэ больш умацуем гаспадарчую і абаронную магутнасць радзімы.

Рэдакцыі газеты „Акцябр"

Рэдакцыя газеты «Звязда» віншуе свайго субрата па зброі — калектыў работнікаў і чытачоў рэспубліканскай яўрэйскай газеты «Акцябр» з 15-годдзем існавання газеты.

За пятнаццаць год свайго існавання газета «Акцябр» правяла вялікую работу па прапагандзе ідэй марксізма-ленінізма, з'яўляючыся арганізатарам мас на барацьбу за перамогі сацыялізма, за ўмацаванне эканамічнай і абаронай магутнасці нашай сацыялістычнай радзімы.

Пятнаццацігодзе газеты «Акцябр» — яркае сведчанне трыумфа ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. Толькі ў краіне Совецтаў, у краіне, азаронай яркімі праменнямі сонца Сталінскай Канстытуцыі, працоўныя ўсіх нацыянальнасцей маюць права і магчымасць развіваць сваю культуру, нацыянальную па форме і сацыялістычную па зместу.

Газета «Акцябр» выхавала нямала яўрэйскіх совецкіх паэтаў і пісьменнікаў, якія зброяй мастацкага слова служаць справе партыі большэвікоў, справе комунізма.

Нясіце і надалей высока сцяг Леніна—Сталіна, арганізоўвайце і мабілізуйце масы працоўных на барацьбу за далейшае ўмацаванне эканамічнай і абаронай магутнасці СССР, за новыя і новыя перамогі комунізма!

Жадаем поспехаў у рабоце!

Рэдакцыя газеты „Звязда"

Аб правядзенні 17-й гадавіны з дня смерці В. І. Леніна

БРЭСТ. (Кар. «Звязды»). Бюро Брэсцкага гаркома партыі прыняла пастанову аб мерапрыемствах па правядзенню 17-й гадавіны з дня смерці Владзіміра Ільіча Леніна.

На прадпрыемствах і ва ўстановах, а таксама ў школах адбудуцца гутаркі і чытка літаратуры аб жыцці і дзейнасці Владзіміра Ільіча.

З 20 па 25 студзеня на прадпрыемствах, ва ўстановах і школах, а таксама на былых выбарчых участках будуць праведзены сходы, прысвечаныя памяці Владзіміра Ільіча. 21 студзеня адбудзецца агульнагарадскі сход партыйнага, комсамольскага, совецкага і профсаюзнага актыва з дакладам: «17 год без Леніна па ленінскаму шляху, над кіраўніцтвам таварыша Сталіна».

Насустрач XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі

СПАБОРНІЦТВА ДВУХ ЗНАТНЫХ СТАХАНАВАК

ВІЦЕБСК. (Па тэлефону). СтахаНаўцы віцебскай чулочна-трыкатажнай фабрыкі імені Клары Цэткін з кожным днём павышаюць прадукцыйнасць працы, павялічваюць выпуск прадукцыі. Фабрыка дала звыш снежаньскага задання прадукцыі на 197 тыс. рублёў. Добрыя і якасныя паказальнікі: замест 92 проц. па плану вышэйшага прадукцыі першага сорта 94,5 проц.

Увесь калектыў фабрыкі з вялікай цікавасцю сочыць за спаборніцтвам двух лепшых стахаНавак—многастаночніц вязальнага цэха тт. Вараб'ёвай і Рэйман. 2 студзеня тав. Рэйман, абслугоўваючы 5 машын, зрабіла за змену 40,5 дзесятка пар наскоў, перавысіўшы ўсесаюзны рэкорд, устаноўлены тав. Вараб'ёвай некалькі дзён назад.

Даведаўшыся аб дасягненнях сваёй сяброўкі, прышоўшая на другую змену тав. Вараб'ёва рашыла не адстаць. К канцу змены была падлічана яе выпрацоўка, і аказалася, што яна дала 41 дзесятак пар наскоў. Гэта—новы ўсесаюзны рэкорд.

Так канкрэтнымі справамі ўключыліся стахаНаўцы ў сацыялістычнае спаборніцтва імені XVIII партыйнай канферэнцыі.

Правільна арганізавалі працу

БЯЛЫНІЧЫ, 6 студзеня. (БЕЛТА). Перадавая ў Магілеўскай вобласці Беларуская МТС поўнасцю закончыла рамонт трактараў.

Рамонт праводзіўся брыгадна-вузлавым метадам. За кожным вузлом былі замацаваны кваліфікаваныя работнікі МТС, перадавыя трактарысты і брыгадзіры. Для рэстаўрацыі запасных частак быў арганізаван падсобны цэх.

Узоры стахаНаўскай работы паказалі трактарысты брыгад тт. Вайтовіча і Духовіча. Яны выконвалі свае планы на 120—150 проц.

Калектыў МТС абавязаўся да дня адкрыцця XVIII партыйнай канферэнцыі адрамантаваць усе камбайны, ільнаперабілкі, сеялкі, жняркі і ўвесь астатні інвентар і дапамагчы калгасам сваёй зоны закончыць рамонт сельскагаспадарчага інвентара.

Для павышэння кваліфікацыі і агратэхнічнага ўзроўню трактарыстаў пры МТС арганізаваны кароткатэрміновыя курсы.

РЭКОРД БРЫГАДЫ тав. АГАФОНАВА

ГОМЕЛЬ. (Кар. «Звязды»). У пэхах, зменах і брыгадах Гомельскага суднабудаўнічага завода социялістычнае спаборніцтва імені XVIII партыйнай канферэнцыі праходзіць пад знакам барацьбы за датэрміновае выкананне плана рамонту суднаў.

Застрэльшчыкам у спаборніцтве выступіла брыгада кацельна-зварачнага цэха (брыгадзір т. Агафонаў), якая штодзённа выконвае сваю норму на 716 проц. За ёю ідуць брыгады тав. Маміна, выконваючая сваю норму па 370 проц., і тав. Барадзіна—на 366 проц.

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА КАЛГАСНІКАЎ

ПОЛАЦК. У калгасах раёна шырока разгарнулася социялістычнае спаборніцтва імені XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі. Калгаснікі абавязаліся сустрэць канферэнцыю заваршэннем усіх падрыхтоўчых работ да веснавой сяўбы.

Члены сельскагаспадарчых арцелей імені Сталіна і «Пяцігодка ў чатыры гады» поўнасцю адсартавалі насенне, давялі яго да пасеўных кондыцый, адрамантавалі ўвесь сельскагаспадарчы інвентар.

Разгарнулася спаборніцтва калгасных кавалёў за датэрміновы рамонт інвентара. Каваль калгаса «Авангард» Адам Андрушкевіч штодзённа выконвае заданне на 200 проц. Ён ужо адрамантаваў 25 плугоў, 30 бароп «Зігзаг», 10 спружынных барон і акаваў 18 калёс. Па паўтары нормы выпрацоўваюць у дзень кавалі калгаса «Металіст» Іван Карнілаў і Владзімір Храпоўскі.

1.431 ПРОЦАНТ ЗАДАННЯ

НАРОЎЛЯ, 6 студзеня. (Па тэлефону). У адказ на рэкорд брыгады т. Вайстрацепкі, брыгада лесарубаў тав. Ф. Н. Рэнчкоўскага ў саставе 7 чалавек 4 студзеня загатовіла за адзін дзень 365 кубаметраў драўніны, што складае 1431 проц. дзённай нормы. Брыгада за гэты дзень зарабіла 1.443 руб. 62 кап.

Падрыхтоўка да лыжнага кроса імені тав. Тімашэнка

У часцях Заходняй Асобай Ваеннай Акругі разгарнулася ўзмоцненая падрыхтоўка да Усеармейскага лыжнага кроса імені Маршала Совецкага Саюза тав. Тімашэнка.

У Н-скай часці чырвонаармейцы штодзённа ў часе ранішняй фіззарадкі адпраўляюцца ў лыжныя прагулкі на 3—5 кілометраў. У выхадны дзень, 5 студзеня, у часці адбыліся спаборніцтвы лыжнікаў на быстрэйшае пераадоленне 20-кілометравай дыстанцыі. Пяршынства заваявала падраздзяленне, якім камандуе тав. Смірноў. Курсант гэтага падраздзялення тав. Музыкантаў прайшоў дыстанцыю за 1 гадзіну 20 мінут.

Комсамольская арганізацыя Н-скай часці ўзяла на сябе ініцыятыву падрыхтоўкі да лыжнага кроса Агульны сход комсамольцаў намеціў рад каштоўных мерапрыемстваў. У першых чыслах лютага адбудзецца ваенізіраваны лыжны пераход на 100 кілометраў. Рэгулярна праводзіцца трэніроўка лыжнікаў па перасечанай мясцовасці. (БЕЛТА).

ЗАКРЫЎСЯ АГУЛЬНЫ СХОД АКАДЭМІІ НАВУК БССР

4 і 5 студзеня адбыўся агульны сход акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў Акадэміі навук БССР. У парадку дня сходу — абмеркаванне задач, якія стаяць перад Акадэміяй, і зацвярджэнне тэматычнага плана на 1941 год, а таксама арганізацыйныя пытанні.

З дакладам аб задачах Акадэміі ў святле апошняга рашэння Соўнаркома БССР і ЦК КП(б)Б аб рабоце Акадэміі навук БССР выступіў віцэ-прэзідэнт Акадэміі В. А. Леонаў.

На гэтым пасяджэнні таксама разгледжаны арганізацыйныя пытанні. Першым было абмеркавана пытанне аб давыбранні сапраўднага члена Акадэміі навук БССР. Тайным галасаваннем сапраўдным членам Акадэміі навук БССР алнагалосна выбран В. А. Леонаў.

Агульны сход зацвердзіў састаў рэдакцыйнага совета Акадэміі ў колькасці 14 чалавек пад старшынствам акадэміка С. М. Ліпатава. Затым сход зацвердзіў дырэктарамі інстытутаў Акадэміі: акадэміка Г. І. Ануфрыева — дырэктарам інстытута торфу, акадэміка Н. М. Нікольскага — дырэктарам інстытута гісторыі, акадэміка В. Н. Лубяка — дырэктарам інстытута эканомікі, члена-карэспандэнта Б. В. Ерафеева — дырэктарам інстытута хіміі.

Другое пасяджэнне агульнага схода было прысвечана разгляду тэматычнага плана па 1941 год. З дакладам выступіў віцэ-прэзідэнт акадэмік С. М. Ліпатаў. Дакладчык адзначыў, што ў адрозненне ад мінулых год тэматычны план 1941 года намячае распрацоўку вядучых праблем, якія маюць актуальнае значэнне для народнай гаспадаркі рэспублікі.

Агульны сход прыняў рэзалюцыю аб рабоце і далейшых задачах Акадэміі навук і зацвердзіў тэматычны план работы на 1941 год.

На заключным пасяджэнні з цікавым дакладам на тэму «Біяхімія мышачнай дзейнасці» выступіў віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук УССР акадэмік А. В. Палладзін. У спрачках па дакладу выступілі акадэмікі Маркаў і Пракапчук, прафесар Ветохін і інш.

На гэтым агульны сход Акадэміі навук БССР закрыўся. (БЕЛТА).

НАРАДА ПЕРАДАВІКОЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

МАЛАДЗЕЧНА. (Кар. «Звязды»). Днямі адбылася раённая нарада перадавікоў сельскай гаспадаркі, у якой прынялі ўдзел старшыні калгасаў і сельсоветаў, брыгадзіры, стахаНаўцы паляводства і жывёлагадоўлі сельскія актывісты. Нарада абмеркавала даклад загадчыка райза тав. Тагановіча аб выніках мінулага сельскагаспадарчага года і задачах павышэння ўраджайнасці і развіцця жывёлагадоўлі ў бягучым годзе.

Маладыя калгасы раёна ў першым годзе сваёй арцельнай працы дасягнулі значных поспехаў. Сярэдняя ўраджайнасць па калгасах раёна склала 12,5 цэнтнера збожжа і 204 цэнтнеры бульбы з гектара.

Чэсная праца высока аплачваецца. Калгаснікі атрымліваюць у сярэднім на працадзень па 5,5 кілограма зернавых, 18 кілограмаў бульбы і 9 кілограмаў грубых кармоў для жывёлы. Калгаснікі сельгасарцелі імені 17 верасня атрымалі толькі адной пшаніцы па 50—80 пудоў на сям'ю.

Удзельнікі нарады рашылі ўключыцца ў социялістычнае спаборніцтва ў чэсць XVIII Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі. Яны абавязаліся ўзорна падрыхтавацца да сяўбы, сабраць з кожнага гектара не менш 100 пудоў зернавых, 1.260 пудоў бульбы, 1.800 пудоў гародніны, 27 пудоў ільновалакна. Для забеспячэння высокага ўраджаю намечана ажыццявіць рад агратэхнічных мерапрыемстваў. За зімовы час кожны калгаснік павінен авалодаць агратэхмінімумам. Для гэтага арганізуюцца агратэхнічныя гурткі.

Удзельнікі нарады выклікалі на социялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай калгаснікаў Смаргоньскага раёна.

Першую праверку выканання абавязацельстваў па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы вырашана правесці да дня адкрыцця XVIII Усесаюзнай партканферэнцыі.

Удзельнікі нарады з вялікім натхненнем паслалі прывітанне таварышу Сталіну.

Раённыя канферэнцыі настаўнікаў Мінска

6 студзеня ў Мінску пачалі работу раённыя канферэнцыі настаўнікаў сярэдніх школ. На іх прысутнічаюць звыш 700 чалавек.

На канферэнцыі Сталінскага раёна з дакладам аб выніках работы школ за першае паўгоддзе выступіў загадчык райана тав. Гурчэнка.

Агульная паспяховасць вучняў школ раёна складае толькі 74,3 процанта. Аналізіруючы прычыны нізкай паспяховасці ў радзе школ, дакладчык падкрэсліў, што гэтаму часта садзейнічае недысцыплінаванасць вучняў, дрэнная падрыхтоўка настаўнікаў да ўрокаў, адсутнасць сістэматычнай сувязі школы з бацькамі.

100-процантнай паспяховасці ва ўсіх класах дабіліся заслужаная настаўніца БССР выкладчыца гісторыі 7-й школы тав. Галкіна, настаўніца геаграфіі 5-й школы тав. Ладзята, настаўніца англійскай мовы 2-й школы тав. Палубінская, настаўніца беларускай мовы і літаратуры гэтайжа школы тав. Шкляр і другія.

У 25-й школе большасць тэарэтычных урокаў цесна ўвязана з практычнымі заняткамі ў лабараторыях па фізіцы, хіміі, матэматыцы і прыродазнаўству. У першым паўгоддзі вучні прагледзелі 10 вучэбных кінофільмаў.

Цікавы даклад аб арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы ў 47-й школе зрабіла дырэктар гэтай школы тав. Папова. Тут добра пастаўлена масава-абаронная работа. Вучні заваявалі пяршынства ў VII усесаюзных хімічных спаборніцтвах. Каля 400 вучняў і педагогаў авалодваюць ваеннымі спецыяльнасцямі тапографаў, сувязістаў, гранатаметчыкаў, кулямётчыкаў.

Загадчык вучэбнай часткі 5-й мінскай школы тав. Каржанеўскі расказаў аб арганізацыі і пастаноўцы металічнай работы ў школе.

Раённыя канферэнцыі настаўнікаў прадоўжацца 2 дні. (БЕЛТА).

Па Совецкай краіне

ПАЛЯРНЫЯ ПЛАНТАЦЫІ ГАРОДНІНЫ І ЯГАДНІКАЎ

На беразе возера Імандра размешчаны ўчасткі палярнай станцыі Усесаюзнага інстытута раслінаводства, на якіх вырошчваецца больш тысячы сартоў бульбы. Гэта — самая паўночная ў свеце зона бульбаводства. Станцыя вывела некалькі скаграспелых і марозастойкіх сартоў, якія вытрымліваюць тэмпературу да 5 градусаў ніжэй нуля.

Хібінская бульба па сваіх якасцях лічыцца лепшай. З ёй могуць канкураваць толькі клубні, атрыманыя ад летніх пасадак. Бульба шырока разводзіцца ў калгасах і соўгасах Мурманскай вобласці. Тут атрымліваюць па 12—20 і больш тон клубняў з гектара.

Станцыяй адабраны скараспелыя сарты капусты, буракоў, моркві і іншай гародніны, якія з поспехам вырошчваюцца за палярным кругам у адкрытым грунце. У цяплічах знімаюцца вялікія ўраджаі памідораў і агуркоў. Шляхам вегетатыўнай гібрыдызацыі—прышчэпкі памідора на марозастойкую бульбу і чорны паслен—атрыманы салодкія скараспелыя сарты памідораў, высіваючых у адкрытым грунце.

На працягу некалькіх год на Хібінах плодзіць маліна, парэчкі, суніцы. (ТАСС).

КУРОРТ БЕЛАЯ ГОРКА

ВАРОНЕЖ. (ТАСС). Белая Горка — так называецца новая мінеральная крыніца, выяўленая ў Радчынскім раёне. Вада яе ўладае каштоўнымі лячэбнымі ўласцівасцямі.

Гэтымі днямі тут закончана будаўніцтва завода газіравання і разліву мінеральных вод з гадавой прадукцыйнасцю да аднаго мільёна літраў. У бліжэйшыя дні новая мінеральная вада з этыкеткай «Белая Горка» паступіць у продаж.

У Белай Горцы намячаецца будаўніцтва вялікага курорта.

ЗАКАНЧВАЕЦЦА АКАДЭМІЧНАЕ ВЫДАННЕ «ПРАВДЫ РУССКОЙ»

Інстытут гісторыі Акадэміі навук СССР падрыхтаваў і здае ў друк трэці і апошні том «Правды русской». У гэтым томе змешчаны абшырныя каментарыі да выдатнага гістарычнага помніка Кіеўскай Русі. Работа совецкіх вучоных над выданнем «Правды русской» прадаўжалася пяць год.

Каштоўнейшы дакумент эпохі Яраслава Мудрага быў знойдзен рускім гісторыкам В. Н. Тацішчавым больш 200 год назад — у 1738 годзе. З таго часу нашы вучоныя ўпорна шукаюць розныя спіскі «Правды русской». Для акадэмічнага выдання скарыстаны 88 спіскаў і варыянтаў.

Другі том змяшчае фотакопіі і рэпрадукцыі 15 спіскаў «Правды русской» — ад Сінадальнага (XIII век) да Талстоўскага (XVII век). Шматкаляровым друкам зроблены лісты першага, Троіцкага спіска, упрыгожаныя рускім арнаментам.

Выданне падрыхтавана брыгадай навуковых работнікаў пад кіраўніцтвам акадэміка Б. Д. Грэкава. (ТАСС).



На канале Масква—Волга закончана аўтаматызацыя апошняй ГЭС. На здымку: машынны зал. У авале—дзяжурны інжынер кандыдат ВКП(б) С. Фацюшэнка ля пульта ўпраўлення генератарамі. Фото А. Межуева. (Фото ТАСС).

НАРАДЖЭННЕ ГОРАДА

СТАЛІНАБАД. (ТАСС). У даліне Каратэгіна на месцы старога кішлака Дашцісурх, дзе жыло ўсяго 20 сялянскіх сямей, разгарнулася будаўніцтва горада Новага Гарма — цэнтра Гармскай вобласці.

Ужо здан у эксплаатацыю першы вялікі жылы дом, пабудаваны будынкі педагагічнага вучылішча і школы, заканчваецца будынак аблвыканкома і абкома партыі. Быстрымі тэмпамі ідзе будаўніцтва яшчэ чатырох жылых дамоў, кінотэатра, Дома сувязі і іншых будынкаў.

На будаўніцтва новага горада ў мінулым годзе зрасходвана звыш двух мільёнаў рублёў, вялікія сродкі адпускаюцца ў бягучым годзе.

Новы Гарм ствараецца ў жывапісным мясцовасці паміж двума прытокамі бурнай ракі Сурхоб-Санці-Хор і Сурбоў, акружанымі зялёнымі масівамі лясоў. Недалёка ад горада знаходзіцца цёплае возера, на якім будуць пабудаваны пляж, водная станцыя.

На беразе ракі Сурхоб разбіваецца вялікі парк культуры і адпачынку. Высаджана 2.000 дэкаратыўных дрэў.

У 25 кілометрах ад Новага Гарма праходзіць вялікі Памірскі тракт. Вясною калгаснікі злучаць яго з абласным цэнтрам добрай аўтамабільнай дарогай.

ЗБОРНІК «БОЛЬШЕВИСТСКАЯ ПЕЧАТЬ»

Палітвыдат пры ЦК ВКП(б) выдаў зборнік матэрыялаў «Большевистская печать». У ім змешчаны асноўныя артыкулы і выказванні Леніна і Сталіна аб друку, іх важнейшыя дырэктывы партыйным газетам. У зборнік уключаны таксама асобныя артыкулы і прамовы кіраўнікоў партыі і ўрада.

Змешчаныя ў зборніку матэрыялы асвятляюць асноўныя этапы развіцця большэвіцкага друку. Уступны раздзел прысвечан падрыхтоўцы і ўзнікненню рабочага друку ў Расіі. У заключным раздзеле кнігі даны выказванні класікаў марксізма-ленінізма о «Новой Рейнской газете», аб мове і тэхніцы друку. (ТАСС).

ЦЭМЕНТ З ПАДЗОЛА

НОВАРАСІЙСК. Сотні тысяч тон адыходаў падзола дае паташная вытворчасць. На адным толькі Армавірскім заводзе скапілася яго 250 тысяч тон. Да гэтага часу, аднак, гэты матэрыял прападаў дарма. Галоўны інжынер завода тав. Марозаў падаў мысль скарыстаць паташныя адыходы для вырабу цэмента.

Зараз ужо закончаны лабараторныя і заводскія доследы на цэментным заводзе «Пролетарый». Яны далі выдатныя рэзультаты.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

За аператыўную і дзейсную партыйную інфармацыю

Чотка пастаўленая партыйная інфармацыя, насычаная канкрэтнымі фактамі з жыцця партарганізацый, прадпрыемстваў і калгасаў, дапамагае партыйным арганізацыям распаўсюдзіць станоўчы вопыт работы, з другога боку, яна садзейнічае быстрэйшай ліквідацыі недахопаў, выяўляемых інфарматарамі.

Пасля пастановы бюро ЦК КП(б)Б ад 17 жніўня 1939 года «Аб становішчы партінфармацыі ў Мінскай вобласці» партарганізацыі значна палепшылі пастаноўку інфармацыі, зрабілі яе больш аператыўнай і насычанай. Пярвічныя партарганізацыі сталі больш паведамляць у райкомы, а райкомы — у абком аб усіх значных фактах і з'явах у жыцці партыйных арганізацый.

Ва ўсіх райкомах партыі вылучаны таварышы з адказных работнікаў партапарата, выконваючыя абавязкі райпартінфарматараў. Вылучаны партінфарматары таксама ў 578 пярвічных партарганізацыях, з іх на бюро РК зацверджаны 173.

Трэба сказаць, што многія з інфарматараў пярвічных партарганізацый паставілі перад райкомамі партыі рад важных пытанняў.

Для прыкладу можна прывесці наступныя факты:

Тав. Пінхасік — партінфарматар хлебакамбіната — у сваёй інфармацыі паведамляў Варашылаўскаму райкому КП(б)Б, што комсамольская арганізацыя камбіната дэнна працуе; комсамольцы на працягу году месяцаў не плоцяць членскіх узносаў, комсамольскія справы захоўваюцца ў загадчыка склада. У выніку прынятых райкомам мер работа гэтай арганізацыі наладзілася.

Па інфармацыі тав. Сіротка аб раскрадванні калгаснай маемасці ў калгасе «Чырвоная іскра», Пухавіцкага раёна, былі прыняты меры і вінаватыя асуджаны.

Па інфармацыі тав. Марошка (Слуцк) былі ўскрыты буйныя недахопы ў рабоце масла-сыраварнага завода і змянена кіраўніцтва прадпрыемства. Райкомам партыі прыняты меры, забяспечваючыя выкананне заводам вытворчай праграмы.

Асобныя інфарматары пярвічных партарганізацый прабуюць свае сілы і ў абагульненні станоўчага вопыту партыйнай работы.

Партінфарматары 1-га клінгарадка (Мінск) тав. Паперна і радыёзавода тав. Лебедзеў у сваіх інфармацыях паведамлялі аб станоўчым вопыце гэтых партарганізацый у кіраўніцтве соспаборніцтвам і пастаноўцы агітацыйна-масавай работы.

Аднак, трэба сказаць, што не ва ўсіх райкомах і пярвічных партарганізацыях узяляецца дастатковая ўвага партыйнай інфармацыі.

Той факт, што ў палавіне пярвічных партарганізацый вобласці адсутнічаюць інфарматары, ўжо гаворыць аб многім. На 1 снежня 1940 г. зусім адсутнічалі інфарматары ў пярвічных партарганізацыях Грэскага, Мінскага, Плешчаніцкага і Чэрвеньскага раёнаў. У многіх выпадках інфарматары падбіраліся фармальна, і ніякай работы з імі не праводзіцца, што, вядома, адбіваецца на якасці партыйнай інфармацыі.

Вельмі часта інфармацыйныя паведамленні носяць характар статыстычных зводак. У іх толькі канстатыруюцца факты без глыбокага аналіза і абагульнення з'яў. Зразумела, што лічбы ў інфармацыях не павінны ігнэрыравацца, але нельга толькі імі абмяжоўвацца. Інфармацыя павінна быць аператыўнай, палітычна вострай, абагульняючай станоўчы вопыт у рабоце і ўскрываючай недахопы.

Не ўсе райкомы партыі лічаць сваім абавязкам своечасова паведамляць у абком аб усіх важнейшых фактах з жыцця партарганізацый раёна. Вось Халопеніцкі райком за ўвесь 1940 год прыслаў усяго 4 партінфармацыі і тыя — толькі па запросу абкома. Ні адной інфармацыі па агульных пытаннях работы і жыцця партарганізацыі станоўчага або адмоўнага характару райком не прыслаў. Такое-ж становішча і з Бягомльскім райкомам, які абмяжоўваецца толькі паведамленнямі аб правядзімых кампаніях, і то толькі па запросу. Гэта ў той час, як Чырвонаслабодскі райком за ўказаны перыяд прыслаў абкому 21 інфармацыю, Пухавіцкі — 19 і т. д.

Некаторыя райкомы пасылаюць не інфармацыю, а бюракратычныя пісулькі. Асабліва вызначаецца гэтым Стараларожскі райком партыі. Інфармацыі, якія ён пасылае, — казённага зместу і пачынаюцца звычайна так: «На ваш нумар паведамляецца...» і так далей. Прыкладна, такія-ж «інфармацыі» паступаюць з Копыльскага райкома.

Асобае значэнне мае работа над пратаколамі, якія з'яўляюцца важнейшай крыніцай партыйнай інфармацыі.

Тав. Л. М. Кагановіч на нарадзе загадчыкаў аддзелаў кіруючых партыйных органаў 3 верасня 1934 года ўказаў: «Трэба, каб быў апарат, які будзе сістэматычна чытаць «сумныя» пратаколы, які, прачытаўшы 100 пытанняў, прапусціць 90 або нават 98 як правільныя, але 2 пытанні, дапусцім, запэпіць як няправільныя і скажа аб гэтым ЦК партыі (або адпаведна свайму абкому — краёвому)...»

У пратаколах партарганізацый нярэдка можна знайсці нямала пытанняў, патрабуючых умяшання райкомаў. Трэба адзначыць, што ў апошні час у большасці райкомаў партыі наведзен парадак у сэнсе ўчота паступлення пратаколаў ад пярвічных партарганізацый. Інструктары райкомаў чытаюць пратаколы тых партарганізацый, якія яны абслугоўваюць. Ёсць і прыклады рэагіравання на пастаўленыя ў пратаколах пытанні перад райкомамі.

Але, на жаль, мы маем яшчэ нямала фактаў, калі ў райкомах партыі часта прапускаюць пратаколы з няправільнымі рашэннямі, калі на гэтых фактах не вучаць партыйныя арганізацыі сур'ёзна прадумваць кожны пункт прымаемага рашэння.

Буйным недахопам трэба лічыць тое, што райкомы не дабіліся своечасовай прысылкі пратаколаў ад усіх пярвічных партарганізацый. У Мінскім райкоме налічваецца 30 пярвічных партарганізацый, ад якіх пратаколы ў райком паступаюць неакуратна. У Варашылаўскім райкоме ад 42 пярвічных партарганізацый паступілі толькі пратаколы справаздачна-выбарных сходаў; больш пратаколаў яны не пасылалі.

Значна лепш сталі паступаць пратаколы райкомаў у абком партыі. Тут кожны пратакол вывучаецца інструктарамі. Можна было-б прывесці рад выпадкаў адмены няправільных рашэнняў райкомаў, выяўленых па пратаколах. У многіх партарганізацыях і райкомах не знішчаны яшчэ факты неахайных адносін да афармлення пратаколаў. Яны часта пішуцца на кавалачках паперы, не звяртаецца ўвага на граматнасць фармулёвак. Дастаткова сказаць, што ў адной пастанове Уздзенскага райкома партыі налічваюцца 74 граматычныя памылкі.

Бюро абкома 17 снежня 1940 года прыняла спецыяльнае рашэнне аб становішчы партыйнай інфармацыі ў гаркомах і райкомах Мінскай вобласці, у якім патрабавала палепшыць якасць партыйнай інфармацыі, зрабіць яе аператыўнай і насычанай канкрэтнымі фактамі з жыцця партарганізацый, прадпрыемстваў і калгасаў.

Для таго, каб партыйная інфармацыя была пастаўлена як належыць, трэба, каб партінфарматар быў цесна звязан не толькі з партыйным актывам, але і з радавымі комуністамі, з беспартыйным актывам, з совецкай інтэлігенцыяй.

Е. М. ЛЕВІКАЎ,
нам. заг. оргінструктарскага аддзела Мінскага абкома КП(б)Б.

РАЙКОМ АРГАНІЗОЎВАЕ РАБОТУ МЯСЦОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Полацк — старынны горад. Ён мае багатую гісторыю. Тут некалі жыў Пётр I. Яго домік захаваўся і да нашых дзён. У свой час тут былі пабудаваны вядомыя цэрквы, касцёлы. Не было тут толькі аднаго — прамысловасці. Некаторыя тавары першай неабходнасці вырабляліся саматужнікі-адзіночкі.

За годы совецкай улады горад значна вырас, расшырыўся. Асабліва вырасла прамысловасць. Годы тры таму назад тут пушчаны ў эксплаатацыю хлебакамбінат, электрастанцыя, птушкакамбінат, рад цагельных і дрэваапрацоўчых заводаў. Арганізаваны арцелі. На тэрыторыі горада цяпер ёсць 17 прадпрыемстваў і 14 прамысловых арцелей: металаапрацоўчыя, швейныя, скураапрацоўчыя, смалакураныя, шавецкія, мэблевыя, вышывальная і іншыя.

Прамысловасць горада расце, расшыраецца. У прайшоўшым, 1940 годзе прамыслова-кааператыўныя арцелі і прадпрыемствы выпусцілі тавараў шырокага спажывання на 31 мільён 400 тысяч рублёў. Асартымент выпушчаных тавараў шырокі. У яго ўваходзяць ложкі, цвікі, абутак, шкіпідар розных сартоў, вёдры, дзіцячыя веласіпеды, чарнілы, гуталін, карзіны, мэбля, калёсная мазь, пажарны інвентар і многа іншых вырабаў.

Прадукцыю полацкіх арцелей можна сустрэць далёка за межамі горада і нашай рэспублікі. Яна ідзе на Далёкі Усход, у Ленінград, Маскву, Архангельск, Крым, а вырабы сельскагаспадарчых майстэрань — нават у Арктыку.

Прадукцыя майстэрань шырока прадстаўлена ў Маскве, у Гандлёвай палаце. У мінулым годзе сельгасмайстэрні далі мясцоваму насельніцтву прадукцыі на 760.248 рублёў, што складае 111 проц. плана. Арцель «8 сакавіка» выпусціла тавараў на 635 тыс. рублёў. З адыходаў віцебскіх фабрык яна вырабляе розныя світры, дамскія блузы, майкі.

Выпускаемыя арцеллю тавары можна заўсёды купіць у магазінах горада. У любы час у гарадскіх магазінах можна дастаць, напрыклад, добры ізыван, матрацы, зграбную шафу, зробленыя арцеллю «Праўда», і т. д.

Рабоце мясцовай прамысловасці Полацкі райком партыі аддае вялікую ўвагу. Партыйныя кіраўнікі ўсямерна клапоцяцца аб расшырэнні асартымента прамысловых вырабаў. Пытанні работы прадпрыемстваў і прамыслова-кааператыўных арцелей, расшырэння асартымента вырабляемых тавараў не зыходзяць з парадку дня пасяджэнняў бюро РК КП(б)Б.

Характэрны прыклад. У красавіку 1940 г. пагельна-чарапічны завод № 6 не выканаў план. Гэтым зацікавіўся райком партыі. На завод былі пасланы тры таварышы, якія абследавалі яго работу. Ускрылася непрыглядная карціна: адсутнічала працоўная дысцыпліна, мелі месца частыя прагулы і спазненні. Больш таго, тут арудвала шайка раскрадальнікаў дзяржаўнага дабра. Райком аздаравіў кіраўніцтва завода, умацаваў партыйную арганізацыю, паслаўшы туды для работы трох комуністаў. Зараз работа завода значна палепшылася. Гадавы план выкананы.

Райкомам была таксама правядзена праверка выканання Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня ва ўсіх арцелях горада. Вынікі праверкі шырока абмяркоўваліся на партыйным актыве і нарадзе стаханаўцаў. Быў ускрыт рад недахопаў, якія зараз поўнасцю знішчаны. Разам з гэтым стаханаўцы промкааперацыі ўнеслі рад каштоўных прапаноў.

У раёне зараз будуецца новы торфгавод, расшыраюцца механічныя сельскагаспадарчыя майстэрні. Для іх будуецца новае памяшканне, а для рабочых арцелей — светлыя інтэрнаты.

У маі мінулага года бюро райкома заслухала даклады старшынь арцелей «Труд», «Парыжская Комуна» і «Чырвоная вышывальшчыца» па пытанню расшырэння асартымента тавараў. Было рашана пачаць выпуск гудропа, асфальта, рукамыйнікаў, прахладжальных напіткаў, брынзы і т. д. Гэта рашэнне правядзена ў жыццё.

Арцель «Лесгас» арганізавала выпуск палоззяў, абадоў, клёпкі, штукатурнай драні, карзін. Арганізавана таксама арцель па лову рыбы.

Вялікую дапамогу аказаў райком партыі арцелям у падрыхтоўцы да зімы. Пры яго садзейнасці амаль усе арцелі горада добра падрыхтаваліся да зімняга сезона, забяспечылі сябе палівам.

Слоў няма, райком КП(б)Б многае зрабіў для расшырэння прамысловай кааперацыі раёна. Аднак, яшчэ многа прадстаіць зрабіць. У раёне ёсць багатыя залежы торфу. Ёсць таксама да 30 азёр, многа гліны. Трэба ўсямерна скарыстаць гэтыя багацці, арганізаваць выраб гліняных пасудаў, кафеля, чарапіцы. У калгасе «Пролетарый», Арлянскага сельсовета, з поспехам можна арганізаваць арцель па лову рыбы. Такія-ж арцелі можна стварыць у калгасах імені Будзённага, «Комінтэрн», «Дынама» і інш. Неабходна расшырыць выраб абадоў, калёс, саней. У гэтых вырабах калгасы раёна адчуваюць асаблівую патрэбу, якую ўпаўне можна задаволіць.

С. КУЦАЕЎ.

Комсамолка-стаханаўка К. Сідорык (першага цэха швейнай фабрыкі «Кастрычнік»), уключыўшыяся ў соцыялістычнае спаборніцтва на дастойную сустрэчу XVIII партыйнай канферэнцыі, выконвае норму на 169 проц.
Фото Б. Дынкіна.

НА ТЭМЫ ДНЯ

АБ ДОШКАХ ПАЧОТА

Соцыялістычнае спаборніцтва — важнейшая рухаючая сіла ў будаўніцтве комунізма. Яно ўвайшло ў жыццё совецкага народа. Там, дзе партыйныя, профсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі штодзенна і па сутнасці кіруюць соцыялістычным спаборніцтвам, накіроўваюць творчую ініцыятыву мас у патрэбнае русло, там поспехі найбольш значныя.

Штодзённая папулярызацыя дасягненняў стаханаўцаў, штодзённы паказ іх перамог — абавязковая ўмова поспеху соцыялістычнага спаборніцтва. Адною з найбольш простых і разам з тым найбольш яркіх, наглядных форм прапаганды лепшых узораў работы стаханаўцаў з'яўляюцца дошкі пачота і вытворчых паказальнікаў.

Гэты моцны сродак барацьбы за далейшы ўздым соцыялістычнага спаборніцтва, на жаль, не ўсюды скарыстоўваецца.

Хіба можа стымуляваць узлым соцыялістычнага спаборніцтва дошка пачота работнікаў Мінскага аддзялення Захоўпяй чыгункі, калі яна запаўнялася больш 5 месяцаў таму назад? Многія работнікі даўно выбылі з аддзялення, а іх партрэты яшчэ вісяць на дошцы. Няўжо тут няма людзей, імёны якіх павінен ведаць увесь калектыў? Ёсць такія людзі. Але бяда ў тым, што аб дошцы пачота кіраўнікі аддзялення ўспамінаюць толькі тады, калі рыхтуюцца да свята.

Фармальна-бюракратычныя, казённыя адносіны некаторых партыйных і профсаюзных кіраўнікоў да дошак пачота толькі кампраметыруюць гэтыя дошкі ў вачах мас.

На вагонарамонтным заводзе імені Мяснікова апрача пэхавых ёсць агульназаводскія дошкі пачота і вытворчых паказальнікаў. Але яны маюць вельмі непрывабны выгляд.

На агульназаводскай дошцы пачота вісяць партрэты лепшых людзей завода. Партрэты вывешаны яшчэ ў маі 1940 года. Ад часу і дажджавой вады яны павыцвелі, пажаўцелі. Па некалькі разоў у дзень каля дошкі пачота праходзяць начальнік завода тав. Рамашка, сакратар партбюро завода тав. Лобач і старшыня заўкома тав. Лук'янскі, але яны не звяртаюць на яе ніякай увагі.

Аўтарытэт дошкі пачота павінен быць падняты на належную вышыню. Тады кожны палічыць за чэсць быць на дошцы пачота, будзе дабівацца гэтага чэснай стаханаўскай працай.

ПРАВІЛЬНА СКАРЫСТОЎВАЦЬ І ЭКСПЛААТАВАЦЬ ЖЫЛЛЁВУЮ ГАСПАДАРКУ

Жыллёвыя ўпраўленні апрача правядзення неабходных рамонтаў, абавязаны ажыццяўляць кантроль за дакладным выкананнем кватэранаймальнікамі ўсіх правіл карыстання і эксплаатацыі жылой плошчы.

Але сістэма кіраўніцтва ў райжыллёўпраўленнях г. Мінска так арганізавана, што гэтым пытаннем ніхто, па сутнасці, не займаецца. Упраўляючыя дамамі таксама мала цікавяцца захаваннем жыллёвага фонда, не заключаюць дагавораў з кватэранаймальнікамі. Кіраўнік домаўпраўлення № 108 тав. Шчука не заключыў ні аднаго дагавора з жыхарамі. Усяго па гор. Мінску 28.176 кватэранаймальнікаў, а дагаворы заключаны толькі з 14.800. Але і гэтыя дагаворы нікім ніколі не правяраюцца.

Адсутнасць кантроля прыводзіць да таго, што многія жыхары груба нарушаюць правілы карыстання і эксплаатацыі кватэр. Вось факты. У нядаўна заселеным чатырохпавярховым доме № 22/72 па Совецкай вуліцы карыдоры і лесніцы заўсёды забруджаны. На 1-м паверсе ў прыбіральню высыпаюць розгас смецце, косці, шчэпкі. У выніку ракавіна сапсавалася, вада пападае ў ніжнія паверхі, заліває кватэры, з-за чаго сцены і столь гніюць, тынк адвальваецца. Два тыдні назад гр. Ф. Безручка, пражываючая ў кватэры № 8 новага чатырохпавярховага дома па Маскоўскай вуліцы, пайшла на работу і пакінула вадаправодны кран адкрытым. Вада прайшла праз перакрыцці і заліла кватэры ніжняга паверху. Падобны выпадак быў і ў кватэры № 21 гэтага-ж дома.

Гр. Г. Ф. Вішнякоў (кватэра № 20), пайшоўшы на работу, пакінуў уключаны ўцюг. Узнік пажар, які, на шчасце, удалося быстра ліквідаваць.

У доме № 20 па вуліцы Энгельса ва ўсіх трох паверхах ёсць кухні, але ніхто імі не карыстаецца. Прымусы заўсёды запальваюць у карыдорах, з-за чаго сцены і столь закопчваюцца і псуюцца. Або такі прыклад. Тры годы назад быў капітальна адрамантаван дом № 17 на Нова-Мясніцкай вуліцы. У рамонт укладзена каля 200.000 руб. Жыхары атрымалі добра абсталяваныя кватэры. Прайшоў некаторы час. І вось ля ўвахода на другі паверх няма ўжо абодвух дзвярэй, у мансардным памяшканні выбіты вокны, туды заўсёды пранікае снег, валасточныя трубы паламаны. Гэта прыводзіць да быстрага разбурэння ўсяго дома.

Такіх прыкладаў многа. Жыллёвым арганізацыям неабходна ўзмацніць тэхнічны нагляд над поўным захаваннем кватэранаймальнікамі правіл карыстання і эксплаатацыі жыллёвага фонда.

Дзяржаўныя экзамены ў сельскагаспадарчым інстытуце

ГОРКІ. У Горацкім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчым інстытуце арганізавана праходзяць дзяржаўныя экзамены на агранамічным і зоатэхнічным факультэтах.

Па асновах марксізма-ленінізма, селекцыі і раслінаводству студэнты паказваюць добрыя веды. З атрыманых 159 адзнак па гэтых прадметах—110 выдатныя і добрыя. Студэнты-выпускнікі тт. Залескі, Давідовіч, Палеўчанка па ўсіх прадметах атрымалі выключна выдатныя адзнакі.

Паспяхова праходзіць абарона хыпломных праектаў 44-ма выпускнікамі земледзеўпарадчага факультэта. Студэнты тт. Шпак, Калбаскін, Пісарчык, Лабус абаранілі праект на «выдатна».

(БЕЛТА).

Новы асартымент прадукцыі

МАГІЛЕЎ. (Кар. «Звязды»). Магілеўскі металакамбінат у бягучым годзе прыступае да вырабу новага асартымента прадукцыі — складаных станкоў і аўтапрычэпаў.

Калектывам механічнага цэха камбіната ўжо асвоены і вышушчан першы дзесятак аўтапрычэпаў да машын «ЗІС-5». Якасць работы прызнана добрай.

Цяпер у механічным цэху вядуцца падрыхтоўчыя работы да выпуску складанага поўаўтаматнага рэвальвернага станка «Р-22». Прыступлена таксама да серыйнага выпуску свідравальных станкоў «НС-8».

У сувязі з выпускам новага асартымента прадукцыі цэхі металакамбіната атрымліваюць дадатковае абсталяванне. Так, у механічным цэху будзе ўстаноўлена 9 новых станкоў — радыяльна-свідравальны, кругла-шліфавальны, прадоўжна-стругальны, універсальна-фрэзерны, 2 такарныя станкі і інш.

Значна пашыраецца і тэрыторыя цэхаў металакамбіната. Будуць пабудаваны новы дом для заводскай лабараторыі, якой да гэтага часу не было, і новы склад для гатовай прадукцыі.

Т. ЗОМАЎ.

Газеце „Акцябр"—15 год

Грамадскасць Беларускай ССР адзначае 15-годзе з дня аснавання штодзённай рэспубліканскай яўрэйскай газеты «Акцябр» — органа ЦК КП(б)Б.

Ленінска-сталінская нацыянальная палітыка забяспечыла ўцершыню ў гісторыі чалавецтва бурны росквіт нацыянальнай па форме і соцыялістычнай па зместу культуры квітнеючых совецкіх рэспублік — былых адсталых і прыгнечаных калоній царызма.

Пад знакам няўхільнага захавання ленінска-сталінскіх тралыцый расла, загартоўвалася ў барацьбе з ворагамі народа і мацнела армія работнікаў большэвіцкага друку Беларусі, а ў іх асяродзі, роўная сярод роўных пад штодзённым кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б — газета «Акцябр».

Задача, стаяўшая перад газетай «Акцябр» у той перыяд, калі яна была створана, заключалася ў тым, каб дапамагчы партыі і ўраду ўцягнуць у вытворчае жыццё краіны асноўныя слаі яўрэйскага насельніцтва, выхаваць іх у духу пролетарскага інтэрнацыяналізма.

Газета «Акцябр» прарабіла велізарную работу па кааперыраванню яўрэйскай беднаты, саматужнікаў, па арганізацыі прамысловых арцелей і іх умацаванню. Частка гэтых арцелей паступова вырасла ў магутныя механізіраваныя прадпрыемствы.

Газета «Акцябр» праяўляла многа ініцыятывы ў справе яўрэйскага землеўпарадкавання, вяла барацьбу супроць сіяністаў крамнікаў, спекулянтаў, якія імкнуліся развалець сельскагаспадарчыя арцелі. На старонках «Акцябра» мы знаходзім вельмі многа такіх матэрыялаў. «Акцябр» увёў спецыяльную старонку «Яўрэйскі земляроб», дзе аграномы абучалі новага яўрэйскага земляроба апрацоўцы зямлі.

Чым далей, тым усё больш мацнее брацтва і дружба паміж яўрэйскімі і беларускімі сялянамі, а ў 1930 г. заўважаецца масавая інтэрнацыяналізацыя калгасаў. Газета «Акцябр» узмацняе на сваіх старонках інтэрнацыянальна-выхаваўчую работу. У Беларусі пяпер ёсць значная група моцных калгасаў, інтэрнацыянальных па свайму заставу. Напрыклад: інтэрнацыянальны орэнаносны калгас імені Тэльмана (Брагін) вырас з невялікай арцелі «Гофенунг». Выраслі таксама такія магутныя, багатыя інтэрнацыянальныя калгасы, як «1-ае мая» ў Слуцку, які ўзельнічаў ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы і ўзнагароджан дыпломам, орэнаносны калгас «Чырвоны бераг» у Оршы, калгас «Праца» ў Хойніках, калгас «Энергія» ў Клімавічах, «Прагрэс» у Нароўлі і дзесяткі іншых.

З індустрыялізацыяй краіны, разам з бурным ростам нашых фабрык і заводаў магутна вырастае таксама і колькасць яўрэйскіх рабочых у Беларусі. У 1929 годзе агульны лік занятых у прамысловасці яўрэйскіх рабочых складаў 14.552 чал., а ў 1934 годзе — 23.584 чалавекі. За 10 год — з 1926 па 1936 год — лік яўрэйскіх рабочых у БССР павялічыўся на 168 процантаў.

Газета «Акцябр» і ў гэтай галіне праводзіла вялікую работу. Побач з большэвіцкімі газетамі Беларусі—«Звязда», «Рабочим» (зараз «Советская Белоруссия») газета «Акцябр» дапамагала пяперашнім гігантам беларускай прамысловасці, вырасшым з дробных прапоўных калектываў, мабілізуючы яўрэйскіх рабочых на высокія тэмпы працы на вытворчасці.

У годы першай сталінскай пяцігодкі ў Совецкім Саюзе разгарнулася вялікая работа па перабудове народнай гаспадаркі. Народы, вякамі прыгнечаныя, адрадзіліся за новага жыцця. Яны будавалі сваю дзяржаўнасць на аснове геніяльнай ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. Пышна расквітнела культура гэтых народаў. Сярод іншых вызваленых народаў, упягнутых совецкай уладай у здаровае прапоўнае жыццё, быў і яўрэйскі народ. На фабрыках і заводах, на зямельных прасторах Херсоншчыны і Крыма — усюды былі створаны найшырэйшыя магчымасці для пераўтварэння жыццёвага ўкладу яўрэйскіх прапоўных мас.

Узнікае думка аб магчымасці стварэння на Далёкім Усходзе яўрэйскага нацыянальнага раёна. Стаўіцца пытанне аб вызваленні Біробіджанскага раёна для яўрэйскага перасялення. Газета «Акцябр» праводзіць шырокую работу па папулярызацыі і азнаямленню прапоўных мас з Біробіджанскім раёнам.

24 сакавіка 1928 года партыя і ўрад прымаюць рашэнне аб вызваленні Біробіджана для яўрэйскага перасялення. Гэтае рашэнне ўрада выклікае сярод прапоўных Совецкай Беларусі і іншых рэспублік, а таксама сярод прапоўных мас за граніцай вялікі ўзлым і радасць. Газета «Акцябр» уключаецца ў гэту вялікую работу, дае абшырныя справаздачы аб сходах і мітынгах, прысвечаных рашэнню партыі і ўрада, друкуе водзывы, заметкі з месц першых піонераў, жадаючых ехаць у Біробіджан.

У Біробіджане ўзнікаюць новыя пасёлкі, калгасы, фабрыкі, заводы. У 1930 годзе выдаецца закон аб стварэнні ў Біробіджане яўрэйскага нацыянальнага раёна. 6 мая 1934 года яўрэйскі нацыянальны раён Біробіджан аб'яўляецца Яўрэйскай аўтаномнай абласцю. Гэта гістарычнае рашэнне, падняўшае работу ў Біробіджане на новую, вышэйшую ступень, таксама атрымлівае сваё сістэматычнае і канкрэтнае асвятленне на старонках «Акцябра».

К часу арганізацыі газеты «Акцябр» яўрэйскія контрэволюцыйныя партыі, існаваўшыя за Кастрычніцкай рэволюцыі (Бунд, сіяністы і інш.), былі ўжо ў асноўным ліквідаваны ў СССР. Але адгалоскі гэтых партый мелі яшчэ свой уплыў сярод некаторай часткі яўрэйскага насельніцтва. Перад большэвіцкай прэсай стаяла задача выкрыцця ўсіх скрытых ворагаў, якія для выгляду прызнавалі сябе старонікамі совецкай улады. Становішча газеты «Акцябр» ускладнялася ў сувязі з тым, што ўнутры самой рэдакцыі звілі сабе гняздо яшчэ навыкрытыя тады бундаўцы, ашуканчым шляхам прабраўшыяся ў комуністычную партыю і ў совецкі друк.

Шырокія народныя масы сустрэлі «Акцябр» з вялікай радасцю і ўзлымам, алчуваючы, што газета ўзмоцніць выхаваўчую і асветную работу сярод яўрэйскага насельніцтва, будзе выхоўваць яўрэйскія масы ў духу комунізма.

Яўрэйскія народныя масы Беларусі ўбачылі ў «Акцябры» трыбуну, з якой яны могуць выказацца па ўсіх актуальных пытаннях. Так яно і было. Рабкораўская маса «Акцябра» крок за крокам ускрывала на старонках газеты ўсе проіскі замаскіраваных варожых астаткаў яўрэйскіх нацыяналістычных партый.

На аснове пастановы ЦК ВКП(б) ад 14 лістапада 1938 года аб перабудове прапагандысцкай работы пры рэдакцыі быў створан аддзел прапаганды, што забяспечыла значнае паляпшэнне друкаванай прапаганды. Змяшчаемыя на старонках газеты прыстасоўна да «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)» тэарэтычныя артыкулы, кансультацыі, адказы па пытанні аказваюць вялікую дапамогу таварышам, вывучаючым гісторыю большэвізма.

Асвятленне пытанняў партыйнага жыцця на старонках газеты «Акцябр» займае цэнтральнае месца. Газета арганізоўвае паказ станоўчага вопыту работы многіх перадавых партыйных арганізацый, асвятляе пытанні, выцякаючыя з рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б) і ўказанняў таварыша Сталіна.

Асноўныя кадры яўрэйскіх совецкіх пісьменнікаў выраслі ў совецкай літаратуры разам з газетай «Акцябр».

Вершы, якія друкуюцца ў газеце, адлюстроўваюць нашу соцыялістычную рэчаіснасць. Вершы аб нашым шчаслівым жыцці, аб Сталінскай Канстытуцыі, аб Леніне і Сталіне, аб нашых героях, аб стаханаўцах, аб совецкай жанчыне і дзіцяці, аб гераічнай Чырвонай Арміі і дзесяткі іншых вершаў і апавяданняў, адлюстроўваючых высокія патрыятычныя пачуцці совецкіх грамадзян, сістэматычна друкуюцца на старонках нашай газеты.

У часе дэкады беларускага мастацтва ў Маскве газета «Акцябр» дастаткова поўна і ярка асвятляла на сваіх старонках ход дэкады.

«Акцябр» усяляк стараецца выклікаць да творчай работы новыя малодыя кадры пісьменнікаў. Вялікая колькасць маладых пісьменнікаў, выраслых за апошнія годы ў яўрэйскай совецкай літаратуры, знаходзяць месца для сваіх твораў у першую чаргу на старонках «Акцябра».

Вакол газеты згуртавана звыш тысячы рабселькораў. Рэдакцыя перыядычна склікае іх на нарады, дае ім указанні і парады як праз сваіх уласных карэспандэнтаў, так і ў спецыяльных пісьмах. У мэтах узмацнення дапамогі рабкорам і нізавому друку пры рэдакцыі працаваў семінар рабкораў.

Аб росце нашых рабкораў сведчыць ужо той факт, што ў 1937 годзе было скарыстана 1.865 пісем рабкораў, а за 11 месяцаў 1940 года — 2.698.

На працягу 1939—40 гг. рэдакцыя правяла ў радзе гарадоў і мястэчак Беларусі семінары і чытацельскія канферэнцыі.

За апошнія годы калектыў «Акцябра» папоўніўся новымі кадрамі. Рад работнікаў вылучан на адказную работу — загадчыкамі аддзелаў. Усе яны даюць добрыя ўзоры творчага росту.

З важнейшых пытанняў, якімі рэдакцыя займалася ў 1940 г., трэба адзначыць спаборніцтва Трохгорнай мануфактуры з беластокімі тэкстыльшчыкамі, барацьбу інтэрнацыянальных калгасаў за ўдзел ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, барацьбу за правядзенне ў жыццё Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 26 чэрвеня і 10 ліпеня 1940 г.

Дзякуючы дасягнутым за апошнія годы поспехам, у прыватнасці ў галіне асвятлення пытанняў сельскай гаспадаркі, газета «Акцябр» заваявала пачотнае права — стала ўзельніцай Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1940 г.

Пасля з'яднання беларускага народа поле дзейнасці газеты значна расшырылася. Перад рэдакцыяй стаяць новыя задачы ў барацьбе за будаўніцтва соцыялістычнай гаспадаркі і культуры ў заходніх абласцях Беларусі і выхаванне шырокіх яўрэйскіх мас у духу соцыялізма, у духу беззаветнай любві і адданасці радзіме, партыі, вялікаму Сталіну.

У святле гістарычных указанняў таварыша Сталіна, рашэнняў XVIII з'езда ВКП(б) вялікія і адказныя задачы стаяць перад большэвіцкім друкам. Каб з чэсцю справіцца з імі, наша газета павінна пакончыць з радам недахопаў, якія яшчэ ёсць у яе рабоце.

Да ліку недахопаў адносіцца: практыка запаўнення старонак асобных нашых нумароў у большасці матэрыяламі штатных супрацоўнікаў рэдакцыі, слабая работа з пісьмамі працоўных; няўменне часамі ўхапіцца за галоўнае і рашаючае ў рабоце, скальжэнне па паверхні; слабая аператыўнасць. Мова газеты яшчэ не заўсёды дастаткова даступна для шырокіх мас чытачоў.

ЦК ВКП(б) у апошні час прыняў важнейшыя рашэнні па пытаннях перабудовы работы рэспубліканскіх, абласных і раённых газет. Мы абавязаны поўнасцю выканаць рашэнні Цэнтральнага Камітэта, у самыя кароткія тэрміны выправіць указаныя ў пастановах ЦК ВКП(б) недахопы.

15-годзе нашай газеты мы адзначаем у момант, калі працоўныя нашай краіны рыхтуюцца да XVIII канферэнцыі Усесаюзнай комуністычнай партыі большэвікоў.

Перад работнікамі газеты «Акцябр», як і перад ўсёй арміяй большэвіцкага друку, — ляжыць велізарнае поле творчай дзейнасці.

Разгортваючы яшчэ шырэй самакрытыку, па-сталінску вырашчваючы і выхоўваючы кадры, большэвіцкі друк Беларусі і ў тым ліку газета «Акцябр» будзе і далей свята захоўваць слаўныя тралыцыі ленінска-сталінскай «Правды».

Газета «Акцябр», уступаючы ў 16-ты год свайго існавання, ведучы прапаганду вялікага вучэння Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна пад штодзённым кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б будзе верным памочнікам партыі ў барацьбе за далейшае працвітанне нашай краіны, у барацьбе за новыя перамогі ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва.

Е. ЭРЭНГРОС,
рэдактар газеты «Акцябр».

Груба нарушаюць тэхналагічную дысцыпліну

Прамывачны і пал'ёмачны цэхі дэпо Гомель не ўкладваюцца ў нормы прастою паравоза ў рамонце. На працягу мінуўшага года паравозы стаялі ў прамывачным рамонце не менш 28 — 30 гадзін пры норме 14 гадзін; у пал'ёмачным рамонце, пры норме 3,5 сутак паравозы стаялі 7 — 8 і больш сутак.

Не гледзячы на такія вялікія прастоі паравозаў у рамонце, якасць яго выключна нізкая. Цэх прамыўкі меў у лістападзе 55 выпадкаў паўторнага рамонту. Пасля рамонту паравозы па некалькі разоў вярталіся ў дэпо для ліквідацыі раду недаробак. 25 снежня з пал'ёмачнага рамонту быў выпушчан паравоз № 238. Перад пасылкай яго ў першы рэйс было выяўлена 45 дэфектаў. Так званыя недаробкі ставілі пад прамую пагрозу безапаснасць руху паязноў.

Асноўная прычына паўторных рамонтаў — сістэматычныя парушэнні тэхналагічнай дысцыпліны. За апошні час хранічным з'явішчам стала асабленне буксавых падшыпнікаў на паравозах, выходзячых з пал'ёмачнага рамонту. Гэта атрымалася таму, што падшыпнікі на пал'ёмцы не замацоўваюцца прэсам, а ўстанаўліваюцца распоркамі, падганяюцца кувалдай. Між тым набыць прэс —справа зусім не цяжкая.

У пал'ёмачным цэху, як і на прамыўцы, груба нарушаюцца правілы наваркі падшыпнікаў. У пагоні за лёгкім заработкам некаторыя электразваршчыкі не робяць наваркі падшыпнікаў у спецыяльнай ванначцы, а так, «на вока», што часта пры электразварцы падшыпніка ў ім выплаўляецца бабіт.

Перад наваркай дэталі павінны старанна ачышчацца ад гразі, вываравацца ў спецыяльным баку. У цэху пал'ёмкі такі бак ёсць, але ім не карыстаюцца.

У цэху прамыўкі аббелку дышлавага механізма робяць не крэйдай, а вапнай. Апрача таго, дышлавы механізм перад аббелкай не ачышчаюць ад гразі. А ў цэху пал'ёмкі часта зусім не робяць абмельвання дэталей перад іх апрацоўкай. Гэта некалькі разоў прыводзіла да псавання асобных дэталей. Так, зусім нядаўна перастругалі партыю падшыпнікаў, і потым іх прыпалося наварваць.

У дэпо да апошняга часу не было наждачнага палатна. Гэта прыводзіла да таго, што на паравозах ставілі дэталі прама з-пад разца, без старанной апрацоўкі іх.

Аб грубейшых парушэннях тэхналагічнай дысцыпліны ведаюць майстар цэха прамыўкі т. Табанькоў і майстар цэха пал'ёмкі тав. Урбан. Але яны мірацца з гэтым

Саматужніцтва ў рамонце прыводзіць да разбурэння паравознага парка. Кіраўнікі-ж дэпо глядзяць на гэта як на звычайную справу. Узмацніць кантроль за работай брыгад, павысіць патрабавальнасць, пакончыць з нерашучасцю і коснасцю ў скарыстанні абсталявання — просты абавязак майстраў і брыгадзіраў дэпо. Аднак яны таксама мірацца з нарушэннем тэхналагічнай дысцыпліны, не прымаюць ніякіх мер да нарушальнікаў яе.

Не вядзе барацьбы за строгае захаванне тэхналагічнай дысцыпліны і партыйная арганізацыя. Яна абыходзіць моўчкі факты нарушэння тэхналогіі. На пасяджэннях партыйных бюро і на партыйных сходах некалькі разоў падымалася пытанне аб нездавальняючай рабоце рамонтных цэхаў, аб фактах нарушэння працэса апрацоўкі асобных дэталей. Але партыйная арганізацыя і яе сакратар тав. Жытковскі не зрабілі з гэтага неабходных вываадаў. Партарганізацыя дрэнна скарыстоўвае сваё права кантроля дзейнасці адміністрацыі. Такі-ж стыль у рабоце і цэхавых партарганізацый.

Р. СЫРКІН.

Галоўны інжынер упраўлення воднай гаспадаркі Наркамзема БССР П. Шчытнікаў (злева) і начальнік упраўлення воднай гаспадаркі М. Сідоркін. За актыўны ўдзел у правядзенні работ па асушцы балот у 1940 г. ўзнагароджаны Почотнай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Фото С. Вальфсона і К. Якубовіча. (Фотахроніка БЕЛТА).

ШЧОДРЫЯ ДЗЯДЗІ З БЕЛГАЛОЎМАСЛАПРОМА

У Мінску знаходзіцца оптавая база Белгалоўмаслапрома. Гэта невялікая арганізацыя растранжыравала за апошні год многа дзяржаўных сродкаў. Рабіла яна гэта рознымі незаконнымі шляхамі і спосабамі.

На кожнай фабрыцы, кожным заводзе ёсць дырэктарскі фонд. Чаму не можа мець яго і база? Праўда, па каштарысу такі фонд не прадугледжан, але, як відаць, законы для кіраўнікоў базы не пісаны.

Пад выглядам «рэалізацыі» дырэктарскага фонда разбазарана 40 тысяч рублёў. Грошы выдаваліся ў якасці адначасовай дапамогі, прэміі за «высокапрадукцыйную» работу і т. д. Сума вызначалася ў залежнасці ад займаемага становішча, пасады, блізкасці да начальства.

Сам дырэктар базы Гольман атрымаў 850 рублёў, загалчык гаспадаркі Каган— 650 рублёў, старшы таваравед Піца — 550 рублёў, старшы бухгалтар Лагун — 450 рублёў і т. д. На рамонт кватэры намесніка начальніка Галоўмаслапрома тав. Калініна «асігнавана» 2700 рублёў.

На 17 тысяч рублёў перарасходован фонд заработнай платы. Перарасход выклікан павышэннем ставак і ўтрыманнем вялікай колькасці работнікаў звыш штата. Замест аднаго экспедытара працуюць трое. Загалчыка гаспадаркі па штату няма, а на базе такая пасада ёсць.

Ужо два гады база будуе палвал для хавання сыру, але да гэтага часу работа не закончана. Па каштарысу на гэту будоўлю было адпушчана 45 тысяч рублёў. Затым яшчэ некалькі раз асігноўваліся сродкі. Нядаўна будоўлю наведаў інжынер Галоўмаслапрома тав. Бейлін. Ён зрабіў заключэнне, што для ўводу аб'екта ў строй неабходна затраціць яшчэ мінімум 60—70 тыс. рублёў. Куды-ж дзеліся грошы? Аказваецца, што рабочым-будаўнікам выплачвалі не за дзельную работу, а падзённа—па 80 руб. у дзень. Алсюль зусім зразумела, чаму перарасходы па пелімітнаму будаўніцтву складаюць 37 тыс. рублёў.

Усяго база перарасходавала ў 1940 г. 108.700 рублёў.

Ёсць у Мінску два магазіны Маслапрома. Для «кіраўніцтва» імі пры галоўным упраўленні існуе спецыяльная арганізацыя пад назвай «упраўленне розніцы». Тут працуюць: дырэктар, экспедытар, старшы бухгалтар, бухгалтар, шофер.

Згодна пастановы Соўнаркома БССР ад 25 ліпеня 1940 г. гэта «ўпраўленне» павінна быць ліквідавана, а функцыі яго перададзены базе. Што зрабіў Галоўмаслапром? Фармальна «ўпраўленне розніцы» ліквідавана, але штат увесь астаўся на месцы. Людзі акуратна атрымліваюць дзяржаўныя грошы, але нічога не робяць. А начальнік Галоўмаслапрома тав. Кавальчук 5 месяцаў усё дагаварваецца з Наркамфінам аб рэгістрацыі разбуховых штатаў.

М. ПІСКУНОЎ.

АГУЛЬНЫ СХОД—ГАСПАДАР КАЛГАСА

У артыкуле 20 Статута сельскагаспадарчай арцелі сказана: «Агульны сход з'яўляецца вышэйшым органам упраўлення арцелі».

Калектыўнасць — вялікая непераможная сіла калгаснага ладу. Яна параджае невычарпальную народную ініцыятыву, развівае сацыялістычнае спаборніцтва і выхоўвае новых людзей — стахановаў.

Агульны сход з'яўляецца магутным сродкам выхавання ў калгаснікаў сацыялістычных адносін да працы, зброяй барацьбы з лодырамі і дэзарганізатарамі калгаснай вытворчасці.

На жаль, у радзе калгасаў рэспублікі недаацэньваюць значэнне агульнага схода. Часта, пытанні, якія павінны вырашацца агульным сходам членаў арцелі, рашаюцца праўленнем або толькі старшынёй калгаса. Гэта сведчаць многія факты. Напрыклад, былы старшыня калгаса імені Дзімітрава, Малевіцкага сельсавета, Жлобінскага раёна, В. Буднікаў у 1940 годзе дазволіў служачым чыгункі скасіць 42 гектары калгаснай сенажаці для іх асабістых патрэб. Пры чым гэтыя беззаконні рабіліся без дазволу агульнага схода. Буднікаў папіраў калгасную дэмакратыю, дапускаў нарушэнні Статута сельскагаспадарчай арцелі.

Ёсць выпадкі, калі выключалі калгаснікаў з арцелі па пастанове праўлення без зацверджання агульнага схода. Так, у калгасе «Чырвоная змена», Заслаўскага раёна, была выключана па пастанове праўлення калгаса без зацверджання агульнага схода калгасніца А. Гарбацэвіч.

У калгасе «Ленінскі шлях», Дзержынскага раёна, праўленне забараніла выходзіць на работу калгасніцы З. Лобач, матывіруючы гэта тым, што яна не лічыцца ў калгасе і няма дакументаў аб яе прыёме. Хоць Лобач уступіла ў калгас у 1937 г., аднак ёй прапанавана зноў падаць заяву аб прыёме. Старшыня калгаса тав. Адашкевіч без ведама праўлення і агульнага схода калгаснікаў на заяве наклаў рэзалюцыю: «У прыёме адмовіць».

У калгасе імені Варашылава, Грыцкоўскага сельсавета, Халопеніцкага раёна, праўленне калгаса без ведама агульнага схода пастанавіла зняць з калгасніка Х. Леуса 50 проц. працаздзён, выпрацаваных ім у студзені, лютым і сакавіку месяцах 1940 г., за тое, што ён адмовіўся працаваць брыгадзірам(?!).

У калгасе «Большэвік», Шэйскага сельсавета, Крупскага раёна, авансы калгаснікам натурай і грашыма па распараджэнню старшыні калгаса Крывашэіна выдаваліся без уліку выпрацоўкі працадзён. Авансы атрымалі нават тыя калгаснікі, якія маюць вялікую запазычанасць.

Старшыня праўлення Крывашэін без рашэння праўлення і агульнага схода калгаса наладжваў вечары для калгаснікаў, купляў для гэтага віно і розныя прадукты. На гэта ў 1940 годзе затрачана 1.968 рублёў калгасных сродкаў.

У радзе выпадкаў агульныя сходы калгаснікаў прымаюць незаконныя рашэнні. Гэта, напрыклад, мела месца ў калгасе «Чырвоны Май», Крычаўскага раёна. Па прапанове праўлення агульны сход пастанавіў, выключыць з арцелі 70-гадовую калгасніцу Ц. Д. Смычкову — маці чырвонаармейца. Гэтую пастанову матывіравалі тым, што т. Смычкова не выходзіць на работу і выпрацавала толькі 62 працадні. Прычым, на сходзе прысутнічала з 117 членаў калгаса толькі 55, або менш 50 проц. Згодна Статута, такія пытанні павінны вырашацца пры ўмове прысутнасці на сходзе не менш ²/₃ агульнай колькасці членаў арцелі.

У радзе калгасаў агульныя сходы склікаюцца без усякай падрыхтоўкі. Калгаснікаў апавяшчаюць за некалькі гадзін да пачатку схода. Праўленні калгасаў часта дрэнна падрыхтоўваюць пытанні, якія павінен рашаць агульны сход.

Бываюць выпадкі, калі асобныя работнікі раёна або вобласці, прыязджаючы ў калгас, без усякай падрыхтоўчай работы збіраюць агульны сход калгаснікаў.

Асабліва цяпер, калі калгасы прыступілі да размеркавання даходаў, роля агульнага схода павінна быць паднята на належную вышыню. Трэба ліквідаваць усякія спробы нарушэння Статута сельскагаспадарчай арцелі пры размеркаванні даходаў.

Перад канчатковым размеркаваннем даходаў неабходна правесці сур'ёзную палітычную работу сярод шырокіх мас калгаснікаў, раз'ясніць кожнаму калгасніку і калгасніцы, што асноўнай крыніцай іх заможнасці з'яўляецца ўсебаковае развіццё грамадскай гаспадаркі.

Часта пры размеркаванні даходаў лодыры і дармаеды прабуюць пажывіцца за кошт чэсных калгаснікаў. Самі калгаснікі на агульных сходах павінны выкрываць такіх лодыраў і прымяняць да іх усе меры, вызначаныя са Статута сельскагаспадарчай арцелі.

Старшыня калгаса на агульным сходзе, прысвечаным зацверджанню гадавой справаздачы і размеркаванню даходаў, павінен паведаміць калгаснікам аб выніках работы сельгасарцелі за прайшоўшы гаспадарчы год, аб яе дасягненнях і недахопах, расказаць аб метадах работы лепшых калгаснікаў-стахановаў.

15-ты пункт Статута сельскагаспадарчай арцелі прадугледжвае абавязковае заахвочванне працы перадавых брыгад, звенняў і асобных калгаснікаў.

Трэба рашуча пакончыць з ураўнілаўкай пры размеркаванні даходаў. Лепшым брыгадам, звенням, стахановцам, атрымаўшым ураджай вышэй сярэдняга па калгасу, неабходна дадаткова налічаць працадні. І наадварот, трэба знізіць аплату дрэнна працаваўшым брыгадам, атрымаўшым ураджай ніжэй сярэдняга па калгасу.

Калгасы, выканаўшы свае абавязацельствы перад дзяржавай, абавязаны стварыць у першую чаргу ўсе грамадскія фонды, прадугледжаныя пастановай ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб уборцы і загатоўках сельскагаспадарчых прадуктаў» — пасенныя, страхавыя, фуражныя, харчовыя і фонды дапамогі. Яны павінны адлічыць, згодна артыкула 12-га Статута сельскагаспадарчай арцелі, ад грашовых даходаў сродкі па папаўненне недзялімага фонда. Толькі пасля гэтага калгасы могуць прыступіць да размеркавання даходаў па прапанях.

Усебаковае і шырокае абмеркаванне на агульных сходах калгаснікаў вынікаў дзейнасці калгаса за год забяспечыць далейшае арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў.

Грамадская гаспадарка будзе развівацца яшчэ з большым поспехам, калі ў кіраванні справамі сельгасарцелі прыме актыўны ўдзел уся маса калгаснікаў.

А. СУВОРАЎ,
старшы агранам оргкалгаснага аддзела Наркамзема БССР.

Прэміі каучукаводам

Гэтымі днямі Наркамзем Саюза ССР прэміраваў 18 перадавых каучукаводаў нашай рэспублікі. У ліку прэміраваных старшыні калгасаў, брыгадзіры, звеньевыя, аграномы і навуковыя работнікі.

Прэміі ў 1.000 руб. выданы: старшыні калгаса «Шлях Ільіча», Старадарожскага раёна, тав. Д. Чорнаму; брыгадзіру калгаса «Чырвоная дуброва», Рагачоўскага раёна, тав. М. Бардыленка; брыгадзіру калгаса «Будаўнік», Жлобінскага раёна, тав. Беражкову; звеньевому калгаса «Сталінец», Глускага раёна, тав. А. Багук; навуковаму работніку Інстытута балотнай гаспадаркі тав. Б. Мешачок.

На 750 руб. прэміраваны: брыгадзір калгаса «13-ты год Кастрычніка», Рагачоўскага раёна, тав. Б. Казадоеў; брыгадзір калгаса «Ударнік», Любаньскага раёна, тав. М. Гольдберг; звеньевы калгаса «Шлях Ільіча», Старадарожскага раёна, тав. А. Лізунок; брыгадзір калгаса імені Будзённага, Васілевіцкага раёна, тав. Беленькі; аграномы тт. Котаў, Бабак, Віленскі, Янкус і іншыя.

Крытыка і бібліяграфія

Аб журнале „Совецкая школа"

У лютым 1940 года пачаў выходзіць у свет новы педагагічны журнал «Совецкая школа» — орган Наркомасветы БССР.

Няма неабходнасці даказваць значэнне журнала для настаўнікаў і работнікаў аддзелаў народнай асветы. У спецыяльным звароце да чытача рэдакцыя зусім правільна ўказала, што абагульненне і распаўсюджанне вопыта лепшых настаўнікаў — адна з важнейшых задач новазарганізаванага журнала «Совецкая школа». Яна запэўніла чытачоў, што журнал будзе рашуча высоўваць новыя праблемы тэорыі совецкай педагогікі, арганізуе абмеркаванне актуальных пытанняў жыцця школы і настаўнікаў.

Мяркуючы па тэматыцы матэрыялаў, нельга сказаць, каб рэдакцыя поўнасцю выканала свае абяцанні. Зусім пязначнае месца адводзіцца абагульненню і распаўсюджанню вопыта лепшых настаўнікаў. З надрукаваных у журнале 33 артыкулаў зусім пязначная частка можа быць аднесена да катэгорыі абмену вопытам.

Аднак некаторыя з гэтых артыкулаў змяшчаюць у сабе мноства агульных разважанняў, якія безумоўна не могуць аказаць якую-б та ні было дапамогу настаўніку ў яго рабоце. У нумары 1—2 журнала навуковы работнік Н. Н. Стрэйкіс у артыкуле «Повторение пройденного по русскому языку в I—IV классах» дапускае рад грубейшых граматычных памылак. Яна прапануе настаўніку для разбора з вучнямі наступныя сказы: «Темнота все усиливалась. В ущелье вдруг стало темно. На солнце темный лес зардел. Потемнеть заря успела». Затым ставіцца цэлы рад блытаных пытанняў і бессэнсоўных адказаў, выдуманых аўтарам. Напрыклад, «Что значит темнота усиливалась?», «В чем же, следовательно, сходство всех предложений?» Або адказы: «Во всех предложениях говорится про отсутствие света» і т. д.

Блытаніна, як відаць, паходзіць ад таго, што тав. Стрэйкіс не ўяўляе сабе, што наяўнасць ва ўсіх прыведзеных сказах слова з коранем «темн» яшчэ не азначае агульнасці сэнсу сказаў.

Значныя стылістычныя і граматычныя нагрошнасці ёсць і ў радзе іншых артыкулаў. І гэта вынік таго, што рэдкалегія не працуе над матэрыялам. Напрыклад, у артыкуле І. Мамая «Географія лектам» мы чытаем, што вучань у часе летняга адпачынку «...займаецца толькі тым, што яго пікавіць, захоплівае, прыцягвае і вызначаецца ў большай меры акружаючай яго абстаноўкай і асяроддзем. Геаграфія «падручніка» ў часе канікул замяняецца для вучняў геаграфіяй прыроды і геаграфіяй навакольнай жывой эканамічнай рэчаіснасці. Пройдзе вучань міма акружаючага яго геаграфічнага асяроддзя ці спыніцца і задумаецца над некаторымі элементамі і працэсамі — гэта яго справа» (Журнал № 3, стар. 27).

Падобныя разважанні аўтара аб нейкім абстрактным акружаючым асяроддзі і аб адносінах да яго вучняў у часе канікул займаюць цэлую старонку, а правільна выражанай думкі няма. Сапраўды, калі вучань у часе летніх канікул, згодна сцвярджэння аўтара, нічога не павінен рабіць, то аб чым жа тут ідзе гутарка, аб якой летняй рабоце па геаграфіі?

Вельмі вялікай перашкодай у рабоце настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры з'яўляецца адсутнасць метадычных дапаможнікаў. Да гэтага часу слаба абагульваецца вопыт лепшых настаўнікаў-літаратуразнаўцаў. Аднак журнал таксама абыходзіць гэтыя пытанні. За ўвесь мінулы год у вышэйшых пяці нумарах журнала не было змешчана ні аднаго артыкула па пытаннях методыкі выкладання беларускай мовы і літаратуры.

У святле ажыццяўлення пастаўленай таварышам Молатавым на XVIII з'ездзе ВКП(б) перад школай задачы некаторай падрыхтоўкі вучняў да будучай практычнай работы вялікую важнасць набывае сувязь выкладання асноў навук з практыкай сацыялістычнай гаспадаркі. Але і гэта важнейшая праблема не знайшла адлюстравання ў журнале. Няма ў журнале артыкулаў настаўнікаў, дзе-б яны дзяліліся вопытам, як прывіваць вучням практычныя навыкі і любоў да працы.

Істотным недахопам журнала з'яўляецца таксама адсутнасць адзелаў кансультацыі і бібліяграфічных агляда.

Наркомасветы БССР павінен перабудаваць работу журнала «Совецкая школа» з такім разлікам, каб ён поўнасцю адпавядаў узросшым запатрабаванням нашага настаўніцтва.

С. РАСКІН.

ДЗЕСЯЦІГОДДЗЕ ІНСТЫТУТА ЛЯСНОЙ ГАСПАДАРКІ

(Гутарка з дырэктарам інстытута І. А. ХАМЯКОВЫМ).

Нядаўна споўнілася 10 год з дня аснавання Беларускага навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі (Гомель). За 10 год невялікая даследчая станцыя вырасла ў буйную навукова-даследчую ўстанову ўсесаюзнага значэння.

Зараз інстытут мае 6 добра абсталяваных кабінетаў і лабараторый і шырокую сетку апорных пунктаў. Інстытут выхаваў многа навуковых работнікаў. І. Д. Юркевіч, Ф. П. Майсеенка, К. Ф. Мірон, Б. В. Рыўкін, Г. О. Голята і В. П. Сініцкі ў сценах інстытута атрымалі званне кандыдата навук.

За параўнаўча кароткі час інстытутам распрацаваны і скарыстаны ў лясной вытворчасці больш 20 актуальных пытанняў і праблем. Напрыклад, устаноўлена перыядычнасць плоданашэння дрэваў, дана навуковае абгрунтаванне спосабаў рубкі лесу, вывучана гутаперчаноснасць бараладучатага берасклета і ўстаноўлены месцы для штучнага вырошчвання яго; сканструіраваны культыватар і плуг для выкопвання сеянцаў, распрацаваны тэхніка падсочкі хвоі, якая зараз шырока прымяняецца ў лясах БССР, а таксама спосабы падсочкі клёна і бярозы і атрымання з іх сіропу і цукру. Выпрацаваны метады атрымання каніфолі з жывіцы і ўстаноўлен спосаб злабычы абіэтынавай кіслаты з алгоннай вады і т. д.

За 10 год работнікамі інстытута надрукавана 136 навуковых прац аб'ёмам у 185 друкаваных аркушаў. За перавыкананне паказальнікаў Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі рад работнікаў узнагароджаны медалямі Галоўвыстаўкома.

У сваёй далейшай рабоце інстытут будзе ісці па шляху вялікага пераўтваральніка прыроды Мічурына, прыцягне да навукова-даследчай работы шырокі актыў практыкаў-спецыялістаў і стахановаў вытворчасці.

Інстытут ставіць перад сабой задачу далейшага вывучэння тыпу лясоў у заходніх абласцях БССР для правільнай арганізацыі ўсіх лесагаспадарчых мерапрыемстваў.



Осіп Сямёнавіч Целяк — член рыбацкай арцелі імені Сталіна, які працуе на возеры Нарач, Мядзельскага раёна, Вілейскай вобласці. Тав. Целяк мае 40-гадовы стаж работы. Ён прымаў удзел у паўстанні рыбакоў супроць польскага гнёту ў 1936 г.

Фото І. Пышко. (Фотахроніка БЕЛТА).

Да студзеньскіх настаўніцкіх нарад

Е. УРАЛАВА
Нарком асветы БССР

Скончылася першае паўгоддзе 1940—1941 вучэбнага года. Работа настаўнікаў, кіраўнікоў школ і органаў народнай асветы па комуністычнаму выхаванню і навучанню дзяцей у прайшоўшым паўгоддзі была пастаўлена значна лепш, чым у мінулым вучэбным годзе.

Праведзена велізарная работа па ўпарадкаванню школьнай сеткі. У мінулыя гады ў БССР налічвалася звыш 200 карлікавых школ і яшчэ больш класаў з зусім недастатковай колькасцю навучаючыхся. У выніку праведзенай работы органамі народнай асветы аб'еднана звыш 1800 класаў і 100 школ, што дало магчымасць рацыянальна скарыстаць на педагагічнай рабоце звыш 1000 настаўнікаў і зэканоміць вялікую суму дзяржаўных сродкаў.

У мінулыя гады ў нас вялікая колькасць дзяцей, падлягаючых навучанню, заставалася па-за школай. Прычынай гэтаму было тое, што органы народнай асветы або з вялікім спазненнем браліся за ланую работу, або даручалі правядзіць яе выключна школам, не прыцягваючы грамадскасць. Вось чаму ў гэтым годзе Наркомасветы паставіў задачу перад органамі народнай асветы і ўсім настаўніцтвам сістэматычна і канкрэтна займацца ажыццяўленнем закона аб усеагульным навучанні. І калі ў 1939—40 вучэбным годзе школу не наведвала звыш 100 тыс. дзяцей, то к канцу першага паўгоддзя бягучага вучэбнага года па-за школай асталося 27 тыс. дзяцей. Але і гэтая лічба не дае падстаў супакойвацца. Па Беластоцкай вобласці асталося па-за школай 5.256 дзяцей, па Віцебскай вобласці — 4.675. Задача аддзелаў народнай асветы, настаўніцтва і ўсёй грамадскасці — забяспечыць з першых дзён заняткаў школ у другім паўгоддзі 100-процантны ахват дзяцей вучобай.

Асабліва трэба адзначыць рост актыўнасці совецкай грамадскасці за апошні час па аказанню дапамогі школе. Чэрапанаўскі рух знайшоў гарачы водгук у нашай рэспубліцы. Калгаснікі сельгасарцелей «Красін», «Молат», «Комунар» і інш. Чэрвеньскага раёна, Мінскай вобласці, ўзялі на сябе абавязацельствы па аказанню дапамогі школе, прынялі актыўны ўдзел у абсталяванні школьных памяшканняў. На сёнешні дзень усе школы раёна на цэлы год забяспечаны палівам. Выканком Смілавіцкага сельскага совета спецыяльна абмеркаваў пытанне аб уняйрэнні чэрапанаўскага руху. Прамысловыя арцелі сельсовета абавязаліся пашыць абутак і верхнюю вопратку для школьнікаў, зрабіць бачкі для школ і інш.

Алчувальна дапамога грамадскасці школе і ў заходніх абласцях. У Баранавіцкай вобласці прыстасаваны і пабудаваны за год 674 школьныя памяшканні на 52.255 вучнёўскіх месц, у Вілейскай вобласці — 336 памяшканняў на 31.200 вучнёўскіх месц. У адным толькі Слонімскім раёне прыстасавана і пабудавана 32 школьныя памяшканні. А ўсяго ў заходніх абласцях прыстасавана і пабудавана 1.580 школьных памяшканняў на 141.557 вучнёўскіх месц.

Перад органамі народнай асветы стаіць задача яшчэ больш шырыць рух грамадскай дапамогі школе.

У прайшоўшым паўгоддзі была значна лепш пастаўлена работа раённых аддзелаў народнай асветы і педкабінетаў у напрамку аказання дапамогі маладым настаўнікам, у асаблівасці тым, якія ўпершыню прышлі ў школу з кароткатэрміновых курсаў. Па ўказанню Наркомасветы БССР пры няпоўных сярэдніх і сярэдніх школах арганізавана звыш 1000 гурткоў па павышэнню кваліфікацыі настаўнікаў па рускай і беларускай мовах, матэматыцы. Імі ахвачана 1.300 настаўнікаў. У Лунінецкім раёне арганізаваны і сістэматычна працуюць 44 гурткі, у Столінскім — 16, у Мінскай вобласці—142. Аднак, ёсць многа раёнаў (Полацкі і інш.), дзе зусім няма гурткоў. Вельмі мала гурткоў у Палескай вобласці. Гэта трэба ўлічыць работнікам аддзелаў народнай асветы, кіраўнікам школ. Яны павінны ў пачатку другога паўгоддзя арганізаваць гурткі і забяспечыць іх бесперабойную работу.

У рэспубліцы налічваецца многа педагагічных кабінетаў, якія аказваюць вельмі вялікую металічную дапамогу настаўнікам. Сюды можна аднесці Ганцэвіцкі педкабінет (загалчык тав. Дзембінская), Барысаўскі (загалчык тав. Мышленік), Заслаўскі (загалчык тав. Міцько) і інш. Педкабінеты ў бягучым годзе арганізавалі звыш 1.350 сельскіх метадычных аб'яднанняў настаўнікаў, забяспечылі іх канкрэтным планам работы. Аб'яднанні арганізоўваюць лаклады на метадычныя і педагагічныя тэмы, якія, несумненна, прынясуць вялікую карысць настаўнікам.

Аднак, у метадычнай рабоце ёсць істотныя недахопы. Раённыя і гарадскія аддзелы народнай асветы неглыбока вывучаюць школы. Планы метадычнай работы аддзелаў звычайна змяшчаюць у сабе пералічэнне школ, якія намечаны да наведвання работнікамі аддзелаў, прычым бярэцца вельмі многа школ, а на абследванне адводзіцца мала часу (Дзбоўшскі, Церахоўскі, Заблудаўскі, Була-Капалёўскі і іншыя раённыя аддзелы народнай асветы).

Інспектары аддзелаў народнай асветы недастаткова вывучаюць выкладанне асобных прадметаў у школах, работу лепшых дырэктараў, завучаў, настаўнікаў, не папулярызуюць іх вопыт сярод астатніх работнікаў школ.

Перад школай стаіць выключна адказная задача — неаслабна змагацца за пісьменнасць навучаючыхся. Вучань совецкай школы павінен стаць высокаадукаваным і абсалютна пісьменным, культурным ва ўсіх адносінах чалавекам. Выданы Наркомасветы адзіны арфаграфічны рэжым для школ, дапаможны матэрыял, які вызначае віды і колькасць пісьмовых работ, устанаўленне адзіных норм ацэнак у пэўнай меры дапамаглі настаўніцтву ў рабоце над павышэннем пісьменнасці навучаючыхся. Забор'еўская, Сачанская, Гразненская школы, Гарадоцкага раёна, Віцебскай вобласці, забяспечылі высокую паспяховасць і добрую пісьменнасць навучаючыхся. Дзесяткі школ і настаўнікаў, даўшых высокую паспяховасць па рускай мове, налічваецца ў Брэсцкай вобласці. Да ліку такіх можна аднесці Масеўскую школу, Гайнаўскага раёна (выкладчык Е. С. Філіповіч), брэсцкія школы №№ 2 і 12 і іншыя.

Але, не гледзячы на прыкметны рост паспяховасці навучаючыхся па рускай і беларускай мовах, праблема пісьменнасці з парадку дня не знята. Пачаўшыяся студзеньскія нарады настаўнікаў побач з іншымі пытаннямі павінны ўсебакова абмеркаваць і гэта вельмі важнае пытанне.

У мінулым паўгоддзі прыкметна палепшылася выкладанне матэматыкі, звернута выключная ўвага на рашэнне тэкставых задач, паўтарэнне арыфметыкі ў працэсе праходжання курса алгебры ў старшых класах. Трэба, каб секцыі настаўнікаў матэматыкі на студзеньскіх нарадах распрацавалі рад канкрэтных мерапрыемстваў, накіраваных на ўмацаванне матэматычных ведаў навучаючыхся.

Дасягненню поспехаў у рабоце школ садзейнічаў загад Наркомасветы БССР аб выніках 1939—1940 вучэбнага года і задачах новага 1940—1941 вучэбнага года. Загад быў выдан на падставе прапаноў і выступленняў удзельнікаў усебеларускай нарады актыва настаўнікаў і работнікаў органаў народнай асветы. Мерапрыемствы, прадугледжаныя загадам, ахапілі ўсе пытанні работы школы, і там, дзе настаўніцтва было мабілізавана на выкананне загада, паспяховасць вучняў значна палепшылася. Аднак частка аддзелаў народнай асветы і дырэктараў школ не здолелі арганізаваць настаўніцтва на выкананне загада. Пінскі аблана нават у самім Пінску давёў загад да ведама настаўнікаў з вялікім спазненнем. У Касцюковіцкім і Асіпавіцкім раёнах настаўнікі зусім не ведаюць аб існаванні загада. У асобных школах гор. Магілева загад доўгі час знаходзіўся ў стале дырэктараў, а настаўнікі аб ім нічога і не чулі. Гэта высоўвае задачу перад органамі народнай асветы паляпшыць праверку выканання асноўных распараджэнняў і загадаў вышэйстаячых органаў. Неабходна пры абмеркаванні на студзеньскіх нарадах даклада загадчыка раённага аддзела народнай асветы аб выкананні загада — мабілізаваць настаўніцтва на поўнае ажыццяўленне ўсіх мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэнне вучэбна-выхаваўчай работы.

Выконваючы ўказанні таварыша Молатава аб неабходнасці даваць школьнікам хаця-б некаторую падрыхтоўку да іх будучай практычнай дзейнасці, школы БССР перабудоўваюць навучанне ў напрамку ўмацавання сувязі з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва, ліквідацыі фармалізма ў выкладанні. Пакуль найбольш адчувальных поспехаў дабілася ў гэтым напрамку сельская школа. Тут у выніку намагання лепшых настаўнікаў знайшоў шырокае прымяненне вопыт стварэння прышкольных вопытных участкаў і сувязі школ з калгасамі. У Барнавіцкай школе, Дрысенскага раёна, Віцебскай вобласці, вучні пад кіраўніцтвам настаўніка т. Егорава стварылі прышкольны вопытны участак. Вучні Белавежскай сярэдняй школы Гайнаўскага раёна сабралі ў часе экскурсіі вялікую калекцыю мінералаў, якая скарыстоўваецца для праходжання прыродазнаўства ў III класе і мінералогіі ў X класе.

У Пінскай вобласці налічваецца зараз 27 прышкольных вопытных участкаў, на якіх вядзецца даследчая работа па вырошчванню новых відаў раслін. 7 школ Магілеўскай вобласці вядуць каштоўную работу па вырошчванню дынь і тэхнічных культур. Настаўнік Лоўжанскай сярэдняй школы Сіроцінскага раёна тав. Лапца арганізаваў работу вучняў на прышкольным вопытным участку па вывучэнню сістэматыкі раслін; тут-жа закладзен ягадны пітомнік з мічурынскімі сартамі маліны і вінаграда. Гэтыя і сотні іншых школ і настаўнікаў не толькі прывіваюць вучням любоў да сельскагаспадарчай працы, але і даюць ім моцныя веды.

Выхаваўчая работа ў нашых пазашкольных установах адстае ад агульнага росту вучняў. Неабходна перабудаваць работу дамоў і палацаў піянераў, ДТС, станцый юных натуралістаў, таксама як і работу нашых школ, у напрамку прывіцця дзецям практычных навыкаў і любві да працы. Гэтае пытанне павінна заняць віднае месца ў рабоце студзеньскіх настаўніцкіх нарад.

На нарадах трэба таксама абмеркаваць вопыт лепшых настаўнікаў, дасягнуўшых добрых вынікаў у пастаноўцы комуністычнага выхавання, папулярызаваць гэты вопыт.

Нарады павінны намеціць новыя шляхі павышэння якасці навучання і выхавання, умацавання сувязі тэорыі з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва, мабілізаваць настаўнікаў на тое, каб яны працавалі яшчэ больш упорна.

Па ўсёй нашай краіне зараз узнялася магутная хваля сацыялістычнага спаборніцтва імені XVIII Усесаюзнай канферэнцыі ВКП(б). У гэты рух усё больш і больш уключаецца настаўніцтва Совецкай Беларусі. Неабходна кіраўнікам школ і органам народнай асветы ў аснову сацыялістычнага спаборніцтва пакласці наступныя абавязацельствы: поўны ахват дзяцей усеагульным абавязковым навучаннем; барацьба за цвёрдыя веды вучняў па ўсіх прадметах; прывіццё вучням працоўных навыкаў; барацьба за арганізацыю ўзорнай лясцыпліны і выхаваўчай работы ў школе; удзел настаўнікаў у палітыка-асветнай рабоце сярод насельніцтва.

Правядзем студзеньскія настаўніцкія нарады на высокім ідэйна-палітычным узроўні, мабілізуем настаўнікаў на паспяховае вырашэнне задач, стаячых перад совецкай школай!

Англа-германская вайна

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 6 студзеня. (ТАСС). Вярхоўнае камандаванне перадае, што германская падводная лодка паведамляе аб затапленні ёю непрыяцельскіх параходаў тонажам у 20.600 тон. У часе ўчарашніх палётаў германскія самалёты паспяхова атакавалі важныя ваенныя пабудовы ў Паўднёвай Англіі і непрыяцельскія судны паблізу англійскага ўзбярэжжа. Недалёка ад Саутэнда спынілі шлях бамбардыраваны непрыяцельскі параход тонажам ад 3.000 да 4.000 тон. Паспяховай атакі падверглася таксама два непрыяцельскія вартавыя мінаносцы і адно ўзброенае гандлёвае судно.

На працягу дня на Лондан былі скінуты запальваючыя і фугасныя бомбы рознага калібра. Бамбардыроўцы падверглісь заводскія і транспартныя пабудовы, а таксама аэрадром у Паўднёвай Англіі. У апошнюю ноч германская авіяцыя зноў зрабіла налёт на Лондан.

У ноч на 6 студзеня непрыяцель не прадпрымаў налётаў на Германію. Некалькі самалётаў прабавалі пранікнуць на акупіраваную тэрыторыю, але былі адагнаны. Два бамбардыроўшчыкі ўпалі ў мора недалёка ад французскага ўзбярэжжа. Германская авіяцыя страт не мела.

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 6 студзеня, (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца, што ўчора германская авіяцыя скінула над Лонданам сотні запальваючых бомб. Распаўсюджанне ўзнікшых пажараў удалося быстра прадухіліць. Пашкоджана многа будынкаў. Некаторая колькасць людзей была забіта і ранена. Налёты на Ліверпуль і іншыя гарады не нанеслі сур'ёзных страт і не выклікалі вялікіх афяр.

Міністэрства авіяцыі паведамляе, што ўчора да наступлення ночы невялікае злучэнне самалётаў берагавой абароны зрабіла налёт на судны ў доках Брэста і на адзін з аэрадромаў праціўніка. Збіт адзін знішчальнік праціўніка. Усе англійскія самалёты вярнуліся.

Дзеянні англійскай авіяцыі ў Паўночнай Афрыцы

ЛОНДАН, 6 студзеня. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае паведамленне свайго авіяцыйнага аглядальніка. У паведамленні гаворыцца, што дзякуючы паспяховым дзеянням англійскай авіяцыі і англійскіх сухаземных сіл італьянцы былі вымушаны перакінуць свае эскадрыллі з перадавых баз далей на захад. Італьянская авіяцыя, прадаўжае аглядальнік, у сучасны момант дзейнічае, галоўным чынам, абапіраючыся на аэрадромы, размешчаныя па захад ад Тобрука. Згодна атрыманых у Лондане хоць і не пацверджаных вестак, дзве важнейшыя перадавыя італьянскія паветраныя базы, размешчаныя на поўдзень ад Тобрука, захвачаны ў сучасны момант англійскімі сухаземнымі сіламі. Ва ўсякім выпадку дакладна вядома, што англійскія патрулі аперыруюць паблізу гэтых баз і што італьянцы адклікалі адтуль свае авіяцыйныя часці. Некаторыя аэрадромы на ўсход ад Тобрука, напрыклад, Сідзі Азіз, заняты англічанамі і могуць быць скарыстаны для дзеянняў англійскай авіяцыі, якая пасля падзення Бардыі, узмацніла свае налёты на італьянскія аэрадромы ва Усходняй Лівіі. Англійская авіяцыя бамбардыруе італьянскія аэрадромы ў Дэрне, Матрубе, у Эль Газале, Эль Тхімі і іншых пунктах, размешчаных на лівійскім узбярэжжы ў 150 клм. на захад ад Тобрука.

Амерыканская дапамога Англіі

НЬЮ-ЙОРК, 4 студзеня. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Асошыэйтэд Прэс, ваенны міністр ЗША Стымсон прадставіў кангрэсу першыя даныя аб колькасці праданых амерыканскай арміяй «лішкаў» узбраення за 1940 год. У гэтыя даныя ўваходзіць узбраенне, праданае амерыканскай кампаніі «Юнайтэд стэйтс стыл», відаць, для перапродажу Англіі. Усяго амерыканская армія прадала гэтай кампаніі 212 шасцітонных танкаў, 945 тыс. вінтовак, 8.172 тыс. кг. трынітраталуола, 83.581 кулямёт, 2.245 сямідзесяці пяціміліметравых палявых гармат, 316 трохдзюймавых мінамётаў Стокса, звыш 98 тыс. снарадаў, 200 тыс. рэвольвераў, 100 тыс. патронных кулямётных лент, 100 тысяч зарадных скрынак, 25 тыс. аўтаматычных вінтовак Браўнінга з 1 млн. абойм па 20 патронаў у кожнай, 1.081 тыс. патронаў для рэвольвераў, 6.148 тыс. патронаў для кулямётаў і 4 млн. патронаў для вінтовак.

Паведамленне германскага інфармацыйнага бюро аб франка-германскіх адносінах

БЕРЛІН, 5 студзеня. (ТАСС). Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што рад іншакраінных журналістаў звярнуўся ў германскае міністэрства замежных спраў з пытаннем аб франка-германскіх адносінах. У сувязі з гэтым, заяўленне агенцтва, у германскіх афіцыяльных кругах заяўляюць, што ў Берліне з цікавасцю сочаць за дыскусіяй, якая адбываецца ў сучасны момант у французскіх урадавых кругах па пытанню аб франка-германскіх адносінах. У германскім міністэрстве замежных спраў падкрэсліваюць, што пэўная кліка ў Францыі імкнецца сабатыраваць франка-германскае супрацоўніцтва і што ад вынікаў дыскусіі ў Вішы залежыць эвалюцыя франка-германскіх палітычных адносін.

Забастоўка грэчаскіх маракоў у англійскіх партах

ЛОНДАН, 6 студзеня. (ТАСС). Нялаўна грэчаскія суднаўладальнікі аб'явілі аб зніжэнні на 25 — 50 проц. зарплаты маракоў грэчаскіх суднаў. Больш 1.000 грэчаскіх маракоў, якія знаходзяцца ў англійскіх партах забаставала. 52 ужо кінуты ў турму, некаторыя з іх аб'явілі галадоўку пратэста.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі

У ПАЎДНЁВЫМ КІТАІ. За апошнія дні буйных ваенных аперацый на франтах не было. Японцы абмяжоўваліся дзеяннямі авіяцыі. Японская авіяцыя бамбардыравала рад гарадоў у раёне на захад ад Ганконга і некалькі гарадоў уздоўж Кантон-Ханькоускай чыгункі. Ёсць афіцыяльныя звесткі, што японскія войскі колькасцю каля 50.000 прадаўжаюць канцэнтравацца ў раёне Кантона.

Вестак аб становішчы на іншых франтах няма.

6 студзеня. (ТАСС).

АБВЯРЖЭННЕ ТАСС

У замежнай прэсе распаўсюджваецца паведамленне, што паўпрэд СССР у Румыніі тав. Лаўрэнцьеў нібы адклікаецца з Бухарэста.

ТАСС упаўнаважан абвергнуць гэтае паведамленне, як выдуманае.

Здача італьянскіх войск у Бардыі

ЛОНДАН, 6 студзеня. (ТАСС). Афіцыяльна паведамляецца: «Учора гарнізон Бардыі спыніў супраціўленне. Горад з усімі абараняючымі яго сіламі і запасамі ваеннага спаражэння ў нашых руках. Колькасць палонных перавышае 25 тысяч. Сярод палонных — галоўнакамандуючы італьянскімі войскамі ў Бардыі генерал Берганцолі і чатыры другія генералы. Захвачана або знішчана 45 лёгкіх і 5 сярэдніх танкаў».

Ваенны аглядальнік агенцтва Рэйтэр, закранаючы стратэгічнае значэнне Бардыі, падкрэслівае, што, хоць гэты невялікі порт менш зручны, чым Салум, усё-ж разам з апошнім будзе адыгрываць значную ролю ў забеспячэнні снабжэннем англійскіх войск, аперыруючых у Лівіі. Да гэтага часу фронт забяспечваўся з дапамогай аўтатранспарта.

Аглядальнік указвае далей, што пасля ачышчэння раёна Бардыі ад непрыяцеля асноўныя італьянскія сілы будуць знаходзіцца ў раёне Тобрука, на адлегласці амаль 70 міль ад Бардыі. Гэта затрудніць ім контрнаступленне. Па думцы аглядальніка, з падзеннем Бардыі італьянцы страцілі базу для аперацый супроць Егіпта.

Ваенныя дзеянні ў Албаніі

АФІНЫ, 6 студзеня. (ТАСС). Учора вечарам камандаванне грэчаскай арміі паведаміла: «Нашы войскі праводзілі аперацыі мясцовага характару. Захвачана каля 200 палонных і многа ваеннай маемасці».

Камандаванне англійскіх ваенна-паветраных сіл у Грэцыі паведамляе, што ўчора англійская авіяцыя бамбардыравала ваенныя аб'екты ў раёне Эльбасана. Успыхнула многа пажараў. Велізарны пажар пачаўся ў самім Эльбасане. Усе англійскія самалёты вярнуліся.

Газета «Кіноніа» ўказвае, што «ў паўночным сектары праціўнік, сканцэнтраваўшы значныя сілы, прабаваў наступаць, дабіваючыся прарыву па шырокім фронце. Аднак гэта наступленне было адбіта. На цэнтральным участку фронта наступленне праціўніка таксама было адбіта са стратамі для італьянцаў».

НЬЮ-ЙОРК, 6 студзеня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Юнайтэд Прэс, у сектары Валоны адбіты контратакі італьянцаў, панёсшых вялікія страты. Італьянскія войскі на гэтым участку мяняюцца кожныя двое сутак, прадпрымаючы адчайныя спробы ўтрымаць Валону.

Атакі італьянцаў у раёне ўсходніх схілаў гор Кераўніа таксама адбіты. Грэкі праследуюць італьянцаў, адступаючых у напрамку па Дукаці па галоўнай дарозе, ідучай па Валону. У часе ўзрыву маста праз раку Дукаці загінула 150 італьянцаў. У баі ў гарах Кераўніа ўзята ў палон 500 італьянцаў і захвачана 4 палявыя гарматы і 12 кулямётаў.

У сектары Тэпелене грэчаскія войскі захвацілі пункт Фратар і прасунуліся на захад на 5 міль да вёскі Кута.

У сектары ракі Осум грэчаскія войскі дасягнулі гор Остравіцэ, у 9 мілях на паўднёвы захад ад Маскаполе.

КОЛЬКАСЦЬ УЗБРОЕНЫХ СІЛ ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 5 студзеня. (ТАСС). Як перадае агенцтва Асошыэйтэд прэс, па даных ваеннага міністэрства ЗША, колькасць амерыканскай рэгулярнай арміі і нацыянальнай гвардыі складае зараз 608.000 чалавек супроць 250.000 у студзені мінулага года—да мабілізацыі нацыянальнай гвардыі. Колькасць асабовага састава марскога флота і марской пяхоты хутка дасягне 250.000 чалавек.

«Дос клейне ментшэле» у пастаноўцы Дзяржаўнага Яўрэйскага Тэатра БССР. Пастаноўшчык — засл. арт. БССР М. Сокал.

На здымку (злева направа): заслужаная артыстка БССР Ю. Арончык — у ролі Голдэ, артыст М. Бярозкін — у ролі Міхл і артыстка М. Чайгорская — у ролі Шэйндэле.

Лыжныя спаборніцтвы на прыз адкрыцця сезона

У выхадны дзень 5 студзеня ў парку культуры і адпачынку па Пушкінскай вуліцы (Мінск) сабралося многа лыжнікаў сталіцы. У гэты дзень адбываліся лыжныя спаборніцтвы на прыз адкрыцця сезона.

У спаборніцтвах удзельнічалі 27 каманд адзінаццаці добраахвотных спартыўных таварыстваў і нізавых калектываў горада.

Першае месца сярод каманд спартыўных таварыстваў занялі лыжнікі Беларускага ордэнаноснага інстытута фізкультуры. Другое месца — таварыства «Спартак».

Сярод лыжніц лепшыя вынікі паказала тав. Нікалаёнак (таварыства «Спартак»). Дыстанцыю ў 3 кілометры яна прайшла за 15 мін. 35 сек. На 20 сек. пазней яе фінішыравала лыжніца гэтага-ж таварыства тав. Куксевіч.

Сярод мужчын першым фінішыраваў лыжнік тав. Ермакоў (таварыства «Усход»). Каб прайсці дыстанцыю ў 5 кілометраў яму спатрэбілася 21 мін. 19 сек. На другое месца вышаў тав. Грычаны (Інстытут фізкультуры). Яго час — 21 мін. 45 сек.

ЛЫЖНЫЯ ТРЭНІРОЎКІ

БРЭСТ. (Кар. «Звязды»). Комсамольскія і фізкультурныя арганізацыі абласці паставілі перад сабой задачу падрыхтаваць да ўдзелу ў комсамольскім лыжным кросе 10 тысяч чалавек комсамольцаў і несаюзнай моладзі.

У Семяцінскім і Маларыцкім раёнах ужо створана па 50 каманд, у Брэсцкім сельскім раёне—60, у Высокаўскім—15, у горадзе Брэсце — 120 каманд. Усе каманды пачалі вывучэнне правіл хаджэння, паваротаў, спускаў па лыжах. 10 каманд Брэсцкага чыгупачнага тэхнікума прайшлі ўжо 60 кілометраў трэніровачнага мінімума. Дзве каманды Ружанскага райаддзялення НКВД здалі лыжны комплекс ГПА і прайшлі да 100 кілометраў трэніровачнага мінімума.

Абласны Камітэт па справах фізкультуры і спорта праводзіць ва ўсіх раёнах абласці курсы грамадскіх інспектараў па лыжах. Курсы пачалі ўжо работу ў Семяцінскім, Высокаўскім, Брэсцкім сельскім раёнах і ў горадзе Брэсце.

У многіх месцах, аднак, дагэтуль не зразумелі ўсяго значэння кроса. У Гайнаўскім і Кобрынскім раёнах, напрыклад, падрыхтоўка да кроса зусім не распачата. Там яшчэ не створана ні адной каманды. Людзі, якія непасрэдна адказваюць за падрыхтоўку кроса ў гэтых раёнах, скарыстоўваюцца не па прызначэнню. Старшыню Камітэта па справах фізкультуры і спорта Гайнаўскага раёна тав. Дацкевіча назначылі старшым учотчыкам па перапісу жывёлы. У «штатнага» ўпаўнаважанага па розных кампаніях ператвораны і старшыня Камітэта па справах фізкультуры і спорта Кобрынскага раёна тав. Фалкоў.

Затрудняе падрыхтоўку да кроса недастача лыж. На сёнешні дзень у фізкультурных арганізацыях абласці іх усяго паўтары тысячы. Ружанскі райпромкамбінат—адзіны пастаўшчык лыж у абласці, але ён пакуль нездавальняюча спраўляецца з гэтай задачай. Камбінат выпускае толькі 50 пар лыж у дзень, замест магчымых 100 пар.

НОВЫЯ СОРТАВЫПРАБАВАЛЬНЫЯ ЎЧАСТКІ

З 1937 года ва ўсходніх абласцях БССР працуюць 22 сортавыпрабавальныя участкі. У 1939 годзе быў арганізаван яшчэ адзін сортавыпрабавальны ўчастак — на асушаным балоце ў калгасе «Чырвоныя Лукі», Васілевіцкага раёна. Перад участкамі пастаўлена задача ў найкарацейшы тэрмін выявіць і ўнядрыць у калгасную вытворчасць высокаўраджайныя сарты сельскагаспадарчых культур. У гэтым напрамку ўчасткамі прароблена вялікая работа.

Зараз, згодна пастановы Соўнаркома БССР, у калгасах заходніх абласцей рэспублікі арганізуецца 17 новых участкаў, у тым ліку 2 на асушаных балотах. З вясны гэтага года сортавыпрабаванне ў заходніх абласцях будзе праводзіцца на сортаўчастках.

КІНОФЕСТЫВАЛЬ У МАГІЛЕВЕ

МАГІЛЕЎ. У кінотэатры «Чырвоная зорка» пачаўся кінофестываль для піонераў і школьнікаў горада. Дзецям будуць паказаны лепшыя кінофільмы: «Вясёлыя рэбяты», «Юныя тэхнікі», «Асабістая справа», «Выбаргская старана», «Маякоўскі» «Седоўны» і іншыя.

Кінофестываль працягнецца да 12 студзеня.

М. БУСЛО.

ЗВЕРСКАЕ ЗАБОЙСТВА

Нялаўна выязная сесія па крымінальных справах Палескага абласнога суда разглядзела справу аб зверскім забойстве гр. Р. Спепановіча.

На судзе было ўстаноўлена, што Р. С. Сысой, які пражывае на пасёлку «Чырвоны Кастрычнік», Казловіцкага сельсавета, Глускага раёна, ехаў са сваім алнасяльчанінам Спепановічам з горада Бабруйска. Ведаючы, што Спепановіч купіў хромавыя боты і тры метры сукна, Сысой рашыў яго аграбіць. Па дарозе ён напаіў Спепановіча і забіў яго. Забраўшы боты, сукно і 300 рублёў грошай, ён укінуў труп у калодзеж.

Забойца прыгаворан да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу.

ЦАРЫК.

Прачытаце гэтыя кнігі

«Юныя піонеры». Кніга «Юныя піонеры» выпушчана рэдакцыяй палітычнай літаратуры Дзяржаўнага выдавецтва пры СНК БССР. Складаецца яна з некалькіх раздзелаў. Простай, яснай, зразумелай мовай расказваецца ў кнізе аб тым, што павінен ведаць важаты піонерскага атрада, кожны піонер.

У першых трох раздзелах даны гістарычныя спраўкі аб паходжанні слова «піонер», узнікненні піонерскай арганізацыі ў нашай краіне і яе выхаваўчым значэнні. На прыкладах гераічных учынкаў дзяцей паказваецца вялікая роля трэцяга пакалення ў агульнай справе пабудовы бясклассавага сацыялістычнага грамадства.

Кніга вучыць піонерважатых, як арганізоўваць выхаваўчую, грамадскую работу ў атрадзе, звяне, вучыць кожнага піонера глыбока авалодваць асновамі навук, паважаць працу, быць культурнымі, любіць радзіму, быць да канца жыцця адданымі комуністычнай партыі і лепшаму другу дзяцей таварышу Сталіну

«Работа совета піонератрада». Ініцыятыва піонераў у арганізацыі работы ў атрадзе — выключна карысная і неабходная справа. Але гэтую ініцыятыву абавязан узначаліць совет атрада. І кніга І. Шынілава «Работа совета піонератрада» вучыць, як выхоўваць піонерскі актыў, арганізоўваць работу звенняў, дабівацца дружбы і спаянасці піонерскага звяна.

Кніга выдана на рускай і беларускай мовах.

Адкрыццё хакейнага сезона

ВІЦЕБСК. (Па тэлефону). Хакеісты горада адкрылі свой сезон тралыцыйным бліц-турнірам. У ім прыняла ўдзел 7 каманд спартыўных таварыстваў «Спартак», «Дынама», «Радзіма» і інш. У фінальнай ігры сустрэліся каманды «Спартака» і «Дынама». Матч закончыўся перамогай «Спартака» з лікам 1:0.

ВЫШАЎ З ДРУКУ

ТЭАРЭТЫЧНЫ І ПАЛІТЫЧНЫ ЖУРНАЛ ЦК КП(б)Б

„Большэвік Беларусі"

ЗМЕСТ

Усім арганізацыям ВКП(б).

Інфармацыйнае паведамленне.

Пленум Цэнтральнага Камітэта КП(б) Беларусі.

Перадавы — Вялікае народнае свята. Матэрыялы Інстытута Маркса—Энгельса—Леніна.

Неапублікаваныя пісьмы Фрыдрыха Энгельса.

І. Сазонаў — Дваццацігодзе плана ГОЭЛРО.

Д. Фішбейн — Смялей перабудоўваць агітацыйную работу.

Б. Абугаў — Большэвіцкі размах партыйнай прапаганды. (Аглядз друку).

ТРЫБУНА ЛЕКТАРА

З. Зліметах — Стратэгія і тактыка партыі большэвікоў у рэволюцыі 1905—1907 гг.

КАНСУЛЬТАЦЫІ

І. Саладкоў — Да 35-годзя снежаньскага ўзброенага паўстання ў Маскве.

Ф. Папоў — Рэволюцыйная барацьба на Беларусі ў 1905—1907 гг.

І. Маневіч — Барацьба «Искры» за ленінскі план пабудовы марксісцкай рабочай партыі ў Расіі.

Паказчык артыкулаў, змешчаных у журнале «Большэвік Беларусі» за 1940 год.

Адказны рэдактар Т. С. ГАРБУНОЎ.

ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ЛЕНІНА ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА БССР

7 студзеня спектакль для школьнікаў

САЛАВЕЙ

Пачатак у 6 г. 30 м. веч.

ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ОРДЭНА ПРАПОРНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР

7 студзеня ДУРА ДЛЯ ІНШЫХ, РАЗУМНАЯ ДЛЯ СЯБЕ

Пачатак у 8 г. 30 м. веч.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР БССР

8 студзеня—раніцай А КРУМЕР ШЫДЭХ

Пачатак у 12 гадзін дня.

вечарам «ЦВЕЙ КУНІЛЕМЛЭХ»

Пачатак у 8 г. 30 м. веч.

Кінотэатр «Чырвоная зорка» ТРЫ ТАВАРЫШЫ

Кінотэатр «Родина» ЯКАЎ СВЕРДЛОЎ

Кінотэатр «Інтэрнацыянал» ПАРТЫЙНЫ БІЛЕТ

Кінотэатр «Спартак» МАЕ УНІВЕРСІТЭТЫ

Дзіцячы кінотэатр СІБІРАКІ

Кінотэатр «Навіны дня»

1. Саюзкінажурналы №№ 112, 113 і 114
2. Журнал «Совецкая Беларусь» № 71.

ВЫДАВЕЦТВУ «ЗВЯЗДЫ» патрабуюцца:

КАЧАГАРЫ І ПРЫБІРАЛЬШЧЫЦЫ.

Звяртацца: Совецкая, 49, другі паверх, пакой 4.

1-я МЕХАНІЧНАЯ ПЯКАРНЯ ПРЫМАЕ НА РАБОТУ НЕКВАЛІФІКАВАНЫХ РАБОЧЫХ І РАБОТНІЦ.

Звяртацца: Старажоўская, 45, аддзел кадраў.

ПЛАН ПРАВЯДЗЕННЯ ТЫРАЖОЎ ВЫЙГРЫШАЎ ПА ДЗЯРЖАЎНЫХ ПАЗЫКАХ НА 1941 год

НАЗВА ПАЗЫКІ	ДАТА І МЕСЦА ПРАВЯДЗЕННЯ ТЫРАЖА											
	Студзень	Люты	Сакавік	Красавік	Май	Чэрвень	Ліпень	Жнівень	Верасень	Кастрычнік	Лістапад	Снежань
ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЗЫКА ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ (выпуск 4-га года)	18 і 19 — 18-ты тыраж, г. Караганда.	—	—	19 і 20 — 19-ты тыраж, г. Іркуцк.	—	—	19 і 20 — 20-ты тыраж, г. Чыта.	—	—	18 і 19 — 21-ты тыраж, г. Архангельск.	—	—
ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЗЫКА ЎМАЦАВАННЯ АБАРОНЫ САЮЗА ССР	—	—	22 і 23 — 13-ты тыраж, г. Ашхабад.	—	24 і 25 — 14-ты тыраж, г. Омск.	—	—	—	27 і 28 — 15-ты тыраж, г. Барнаул.	—	29 і 30 — 16-ты тыраж, г. Бухара.	—
ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЗЫКА ТРЭЦЯЙ ПЯЦІГОДКІ (выпуск 1-га года)	—	1 і 2 — 9-ты тыраж, г. Запарожжа.	—	—	10 і 11 — 10-ты тыраж, г. Хабараўск.	—	—	2 і 3 — 11-ты тыраж, г. Мурманск.	—	—	1 і 2 — 12 тыраж, г. Кіраваад. Азербайджанская ССР	—
ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЗЫКА ТРЭЦЯЙ ПЯЦІГОДКІ (выпуск 2-га года)	—	—	8 і 9 — 5-ты тыраж, г. Волагда.	—	—	—	5 і 6 — 6-ты тыраж, г. Уфа.	—	6 і 7 — 7-мы тыраж, г. Новарасійск.	—	—	6 і 7 — 8-ы тыраж, г. Яраслаўль.
ДЗЯРЖАЎНАЯ ПАЗЫКА ТРЭЦЯЙ ПЯЦІГОДКІ (выпуск 3-га года)	—	—	—	—	—	7 і 8 — 1-шы тыраж, г. Петразаводск.	—	30 і 31 — 2-гі тыраж, г. Львоў.	—	25 і 26 — 3-ці тыраж, г. Беласток.	—	27 і 28 — 4-ты тыраж, г. Тула.
ДЗЯРЖАЎНАЯ ВЫЙГРЫШНАЯ ПАЗЫКА 1938 г.	—	16 — 16-ты тыраж, г. Таліннкент.	—	13 — 17-ты тыраж, г. Варонеж.	—	15 — 18-ты тыраж, г. Одэса.	—	10 — 19-ты тыраж, г. Масква.	—	5 — 20-ты тыраж, г. Кішынёў.	—	14 — 21-шы тыраж, г. Ленінград.

ВЫРАЖ І ЗАХАВАЙ.

УПРАЎЛЕННЕ ДЗЯРЖПРАПАШЧАДКАС І ДЗЯРЖКРЭДЫТА БССР.

ПРЭЗІДЫУМ АКАДЭМІІ НАВУК БССР

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА, што

СЕСІЯ АКАДЭМІІ НАВУК БССР

ПА ПЫТАННЯХ ПАДНЯЦЦЯ ЎРАДЖАЙНАСЦІ І ПРАДУКТЫЎНАСЦІ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

АДБУДЗЕЦЦА з 7 да 12 студзеня г. г.

у памяшканні парткурсаў ЦК КП(б)Б.

ПАВЕСТКА ДНЯ:

1. Аб павышэнні ўраджайнасці ўнядрэнні дасягненняў перадавікоў сельскай гаспадаркі, прадстаўленых на ВСХВ, і скарыстанні вопыта перадавой навукі ў калгасах і саўгасах БССР. (Даклад члена карэспандэнта АН БССР ШЭМПЕЛЯ В. І.).
2. Аб мерапрыемствах па накапленню і правільнаму скарыстанню ўгнаенняў у севазвароце. (Даклад акадэміка КЕДРАВА-ЗІХМАНА С. К.).
3. Аб становішчы і скарыстанні механізацыі ў сельскагаспадарчай вытворчасці БССР. (Даклад акадэміка ВЕЙСА Ю. А.).
4. Аб арганізацыі працы і перспектыўным планіраванні калгасаў БССР. (Даклад акадэміка ЛУБЫКА В. Н. і даклад дацэнта Горацкага с.-г. інстытута — ГАЎРЫЛАВА).
5. Аб мерапрыемствах па стварэнню моцнай кармавой базы ў калгасах і саўгасах БССР у сувязі з увядзеннем правільных севазваротаў. (Даклад акадэміка АЛЯКСЕЕВА Е. К.).
6. Аб павышэнні прадуктыўнасці жывёлагадоўлі БССР. (Даклад галоўнага зоатэхніка НКЗ БССР тав. ГЛУШАКОВА).

Апрача таго ў сесіі прымуць актыўны ўдзел і выступяць са сваімі паведамленнямі акадэмікі — Т. Н. ГОДНЕЎ, А. Р. ЖЭБРАК, С. Н. ВЫШАЛЕСКІ; прафесары — Н. В. НАЙДЗЕНАЎ, М. В. ДАКУКІН, Н. А. ДАРОЖКІН, ОНЕГАЎ, М. М. МАКСІМОВІЧ; ст. навуковыя работнікі: І. Г. ВЛАСЕНКА, А. Е. СЮБАРАЎ, СЯМЁНАЎ, СІЛЬЯНДЭР, РЫЗОЎ, БЕЛЬСКІ, МЕШАЧОК, МУХІН, АЛЬСМІК, РУБАНАЎ, ЛАГАШКІН, ПРЫБЫТКОЎСКІ, ЕВЕЛЕЎ, ІВАНОЎСКІ і дацэнт АРЛОЎСКІ.

АДКРЫЦЦЁ СЕСІІ адбудзецца 7 студзеня ў 6 гадзін вечара.

УПРАЎЛЕННЕ ДЗЯРЖСТРАХА НКФ БССР

ПЕРАМЯСЦІЛАСЯ

ў Доме ўрада з пакоя № 307 у пакой № 45 (цокальны паверх); тэлефоны: 22-060 і № 244 (камутатар Дома ўрада).

БЕЛБРОДТРЭСТУ

патрабуюцца

СТАРШЫ БУХГАЛТАР І БУХГАЛТАР РЭВІЗОР.

Звяртацца: Няміга, 11.

ТРЭСТУ «БЕЛКРУХМАЛ» (пл. Свабоды, 21/1)

патрабуюццэ

для работы на крухмальных заводах у заходніх і ўсходніх абласцях БССР

ГАЛОЎНЫЯ БУХГАЛТАРЫ

з прадастаўленнем кватэры.

Звяртацца да галоўнага бухгалтара трэста.

ПРАГРАМЫ РАДЫЁПЕРАДАЧ

9 СТУДЗЕНЯ, ЧАЦВЕР

ст. РВ-10

00.07—Песні Беранжэ. 00.45—Канцэрт з твораў французскіх кампазітараў. 10.00—Перадача для малодшых школьнікаў. Жыткоў — «Мяцеліца». 12.15—Выступленне дзіцячай мастацкай самадзейнасці мінскага Палаца піонераў. 17.05—Канцэрт для піонераў і школьнікаў пры ўдзеле народнай артысткі БССР Млодзік і заслуж. арт. рэспублікі Амітона. 18.00—Літ. муз. перадача. Егораў—«Буйныя травы». 19.30—Камерны канцэрт з твораў Бетховена. 20.15—Лекцыя ў дапамогу вывучаючым марксізм-ленінізм. Акадэмік Вальфсон — «Совецкая соцыялістычная інтэлігенцыя». 21.05—Сімфанічны канцэрт з твораў Баха, Вівальдзі і Брамса.

Ст. РВ—95

21.30—Канцэрт з твораў совецкіх кампазітараў. 22.30—Рускія народныя песні.

10 СТУДЗЕНЯ, ПЯТНІЦА

Ст. РВ—10

00.07—Мантаж п'есы Лопе дэ Вега — «Дура для іншых, разумная для сябе». 11.00—Лекцыя ў дапамогу вывучаючым марксізм-ленінізм: «Матэрыялізм XVII века». 17.05—Перадача для піонераў і школьнікаў. Джэк Лондан — «Любоў да жыцця». 17.30—Літ. перадача на яўрэйскай мове. Вайсенберг — «Апавяданне пра казу». 18.15—Канцэрт польскай музыкі. 19.30—Артыкул сакратара Віцебскага гаркома партыі тав. Левікава — «Партыкіраўніцтва прамысловасцю». 19.45—Выступленне начальніка Ўпраўлення жывёлагадоўлі Наркамзема БССР тав. Казлова — «Узорнай пастаноўкай жывёлагадоўлі заваюем права ўдзелу ва Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы 1941 года». 20.00—Трансляцыя оперы з Ленінграда.

11 СТУДЗЕНЯ, СУБОТА

Ст. РВ—10

00.07—Літ. муз. перадача на яўрэйскай мове. Шолам Алейхем — «Блуждающие звезды». 00.45—Танцы і песні народаў СССР. 17.05—Перадача для дзяцей — «Жыццё школы». 17.15—Перадача для дашкольнікаў — «Маша-растэряша». 17.30—Літ. перадача—«Беларускі пісьменнік Міхась Машара». 18.15—Канцэрт з твораў беларускіх кампазітараў — Чуркіна, Самохіна і Туранкова. 19.30—Камерны канцэрт з твораў Глазунова. 20.15—Лекцыя ў дапамогу вывучаючым марксізм-ленінізм. Акадэмік Вальфсон — «Совецкая соцыялістычная інтэлігенцыя» (працяг). 21.05—Радыёсустрэча перадавікоў жывёлагадоўлі БССР.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА Мінск Совецкая 49 Тэлефоны рэдакцыі: адказны рэдактар — 20-000 (камутатар) дадатковы — 102 прыёмная рэдактара — 2-13-52 Намеснік адказнага рэдактара — 2-51-88 Адказнага сакратара — 2-13-53 Намеснік адказнага сакратара — 2-24-12 Сакратарыят — 2-59-55 Аддзелаў: заг партыйнага аддзела — 2-18-46 Літработнікаў — 2-13-56 Заг аддзела прапаганды і агітацыі — 2-51-89 Заг эканамічнага аддзела — 2-03-30 Літработнікаў — 2-15-56 Літработнікаў па літаратуры і мастацтву. школах ваенна-фізкультурнай рабоце — 2-18-85 Унутранай інфармацыі — 2-13-60 Аддзела рабселькораў і пісем пранаўных — 2-03-44 і 2-18-45 Заг выдавецтва — 2-13-58 Бухгалтэрыі выдавецтва і аддзела аб'яў — 2-13-09. Выпускаючага — 2-47-68 Карэктарскай—2-13-57.

У1101. Мінск, друкарня «Звязды», Совецкая, 49. М., М., Ш.